STOWARZYSZENIE MUZEUM I OŚRODEK KULTURY BIAŁORUSKIEJ w HAJNÓWCE
17-200 Hajnówka, ul. 3 Maja 42
tel. (085) 682 28 89
BIBLIOTEKA

Голас Радзімы

ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА
БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»

№ 43 (2237)
24 кастрычніка 1991 г. Выдаецца з 1955 г.
Цана 8 кап.

ГАРАЧЫ ЖНІВЕНЬ 1991 ГОДА

Загаловак "Гарачы жнівень 1991 года" на 7-й старонцы ўжо становіцца рубрыкай, пад якой на працягу некалькіх месяцаў вы зможаце прачытаць серыю матэрыялаў журналісткі Таццяны АНТОНАВАЙ, якая сёлета пабывала ў гасцях у нашых суайчыннікаў у ЗША.

Да апошняга моманту, пакуль не села ў самалёт, які кіраваў на Нью-Йорк, не была ўпэўнена, што правяду свой адпачынак за акіянам. Надта ўжо цяжкая гэта справа ў нашай краіне — паехаць па прыватных запросінах да знаёмых у ЗША! Пакуль аформіш усе паперы, атрымаеш візу... Ды што там усе пакуты і бюракратычная цяганіна ў параўнанні з загадкавай Амерыкай і магчымасцю сустрэцца там з нашымі суайчыннікамі, пра якіх неадночы пісала, калі яны прыязджалі ў Беларусь. І чалавечая, і прафесійная цікаўнасць няўмольна падштурхоўвала пераадолець усе перашкоды.

Гарачы жнівень 1991 года. У Нью-Йорку спякота невыносная, пад 40 градусаў. Нават дыхаць цяжка. Спадарыня Ала Орса-Рамана, кіраўнічка танцавальнага калектыву "Васілёк", якая запрасіла мяне, летам мела адпачынак (заняткі ва універсітэце, дзе яна выкладае хімію, павінны пачацца толькі ў верасні). "Што ты хацела б убачыць і з кім сустрэцца? — адразу запыталася яна. — Я склала для цябе праграму: пойдзем у музей сучаснага мастацтва, паедзем на Ніягару, у Вашынгтон — там пераначуем у Алесі Кіпель і наведаем у Рочэстэры Наталлю Арсенневу. Я ўжо з ёй дамовілася; у Саўт-Рыверы будзе выстаўка нашых мастачак, у Нью-Брансвіку пазнаёмішся з Галінай і Васілём Русакамі, наведаем Надзю Кудасаву, выдатную майстрыху. Паглядзім наш Полацак, сходзім у нашыя цэрквы..."

І закруцілася кола падзей. Ледзь толькі ўцягнулі мае валізкі з сувенірамі ў дом на Лонг Айлендзе (раён гэты прэстыжны, дарагі, забудаваны двух-, трохпавярховымі катэджамі, знаходзіцца ўдалечыні ад тлумнага цэнтра), дзе жыве спадарыня Ала з сям'ёй, як завітала яе сяброўка Вера Заморская, пазней падышлі Янка Запруднік з дачкой Верай, прыехалі з працы Віця Тур і сыны Алы — Коля і Павал, далучыўся муж гаспадыні Франэк Рамана, не дачакаліся наступнага дня Валянціна Пархоменка і Аляксандр Казак, якія ў сувязі з хваробай дачкі ўжо год у ЗША...

Першы вечар у Амерыцы, за сяброўскім сталом. Людзі гаманілі, узбуджаныя з'яўленнем госці з Беларусі, распытвалі пра знаёмых, бясконца падкладвалі на талерку, даведаўшыся, што ў нас не густа з ежай. Мы то смяяліся, то плакалі ад радасці, быццам былі найбліжэйшымі сваякамі.

Вопыт першых нашых з Алай азнаямленчых вандровак па Нью-Йорку, калі мы сутыкнуліся з праблемай паркавання машыны, прымусіў прадумваць кожную драбязу: куды едзем, дзе спыняемся, з кім сустракаемся, калі вяртаемся. Сэрца маё рвалася на часткі: хацелася пагуляць па цэнтру Нью-Йорка, асляпляльна прыгожаму, паназіраць за людзьмі ў вольным свеце, якія не маюць комплексаў ні ў манеры апранацца, ні ў сваіх паводзінах, выключна лагодныя і ўважлівыя адзін да аднаго, з'ездзіць на акіян, пасядзець недзе ў бары, словам — распружыніцца ад працы ў газеце. Але над чалавечым гэтым жаданнем увесь час брала верх прафесійнае: лепш пазнаёміцца з нашай эміграцыяй, зразумець, як яны тут жывуць, як застаюцца беларусамі, чаму і за што ў сябе на радзіме іх доўгі час агулам запісвалі ў ворагі і здраднікі; што адбывалася на нашай зямлі ў часы фашысцкай акупацыі, калі адны пайшлі ў партызаны, а другія — у атрады самааховы, як і чаму паехалі з роднага краю.

Афіцыйная наша гісторыя многае замоўчвала альбо трактавала падзеі і факты аднабока і тэндэнцыйна. Толькі з пачаткам перамен мы змаглі тое-сёе даведацца і пра беларусізацыю, і пра расправу з "нацдэмамі", і пра рэпрэсіі, учыненыя над нявіннымі людзьмі. У кожнага свая праўда ў гісторыі. Дасюль мы ведалі толькі адну праўду. А якая ж праўда такіх самых, як і я, беларусаў, што, трапіўшы ў вір гісторыі, апынуліся ў выніку на другім беразе ці, больш дакладна, між берагамі?

Кожны дзень я мела цікавыя сустрэчы, пабывала практычна ва ўсіх асноўных асяродках беларусаў у Амерыцы. Некаторыя землякі, асабліва старэйшага веку, паводзілі сябе даволі насцярожана, даведаўшыся, што я працую ў "Голасе Радзімы", у той самай газеце, якая ў свой час актыўна папракавала на выкрыццё "здраднікаў".

"Дачушка, паслухай, як яно ўсё было, і ты зразумееш..." Я слухала іх споведзі, запісвала на стужку, спадзеючыся выкарыстаць потым у матэрыяле. Не стрымліваючы пачуццяў, жадання выказаць даўно затоены боль ад несправядлівых крыўд, яны ў запале шмат чаго расказвалі, а з раніцы, спахапіўшыся, тэлефанавалі: "Нічога не пішыце пра мяне, закрэсліце ўсё, бо баюся, што гэта пашкодзіць сваякам на радзіме". Жыццё прывучыла іх да асцярожнасці. "Ды што вы, — спрабавала пярэчыць я, — вы ўжо даўно не былі на Беларусі, цяпер не тыя ўжо часы..."

Я зразумела іх вельмі добра 19 жніўня, калі з раніцы па тэлебачанні перадалі пра падзеі ў Савецкім Саюзе, паказалі танкі на вуліцах Масквы. Ашаламляльная гэта інфармацыя прымусіла мяне пахаладзець.

Гарачы жнівень 1991 года... Тры дні Амерыка не адыходзіла ад тэлевізараў. А сітуацыя мянялася штогадзінна, і ніхто не мог ведаць, чым усё гэта скончыцца. Нехта, бывала, не вытрымліваў і пачынаў заказваць па тэлефоне Мінск. Але Мінск маўчаў, упарта маўчаў. Ад невядомасці можна было звар'яцець.

З далечыні, з-за акіяна, мы маліліся за сваю радзіму, за сваякоў і родных, за ўвесь наш народ, на долю якога выпала так шмат выпрабаванняў.

Бадай што, шокам стала чарговая вестка пра абвяшчэнне незалежнасці Беларусі. Тэлефанавалі адзін аднаму, яшчэ не верачы да канца пачутаму, абмяркоўвалі, выказвалі здагадкі і... святкавалі.

Багатая і прыгожая краіна Амерыка. Цяпер ты ўжо не чужая і не невядомая. Вельмі зблізку давялося ўбачыць, як заможна і годна жывуць тут мае землякі. Пачуваюцца людзьмі. Шмат працуюць. Трымаюцца адзін аднаго. Захоўваюць мову, традыцыі і звычаі свайго народа. Толькі дзякуючы ім, напэўна, і ведаюць у Амерыцы, што ёсць такая краіна Беларусь. Шмат чаго робяць, каб дапамагчы сваёй зямлі ў чарнобыльскай бядзе.

...Я вярталася ў сваю бедную, спакутаваную краіну ўжо грамадзянкай незалежнай Беларусі. З надзеямі, з верай у тое, што цяпер усё пойдзе інакш. Гэтак спяшалася. На чыгуначным вакзале, па-беларуску растлумачыўшы вадзіцелю, куды ехаць, пачула рэзкае: "Националистов не возим!" Дзверцы бразнулі перад носам, і я з валізкамі засталася на дарозе.

Спадзяюся, што мае артыкулы, нататкі, інтэрв'ю і рэпартажы, напісаныя пасля паездкі ў Амерыку, будуць уяўляць цікавасць для чытача. Выказваю ў іх свае асабістыя погляды, якія, мяркую, не заўсёды будуць супадаць з агульнапрынятымі. Сёння для вас — сустрэча з Наталляй Арсенневай.

Таццяна АНТОНАВА.

Рытуал вянчання, бадай, такі ж старажытны, як і хрышчэнне. У ім для людзей асаблівая значнасць — таінства злучэння лёсаў. Ці не таму ў апошнія гады маладыя пары ўсё часцей прыходзяць менавіта ў храмы асвяціць свой саюз — на даўгавечнасць і ўзаемаразуменне, на любоў і вернасць. Толькі ў гэтым годзе каля тысячы пар павянчаліся ў цэрквах Брэста.

НА ЗДЫМКУ: вянчанне ў Свята-Сімяонаўскім саборы Брэста.

Фота Э. КАБЯКА.

СУСТРЭЧА З ДЭПУТАТАМІ

ПРАФСАЮЗЫ ВЫХОДЗЯЦЬ НА ПЛОШЧУ

Каля дзесяці тысяч мінчан, прадстаўнікоў іншых абласцей Беларусі сабраліся на плошчы імя У. І. Леніна 15 кастрычніка. У гэты дзень адкрылася чарговая сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, і Федэрацыя прафсаюзаў рэспублікі арганізавала сустрэчу прадстаўнікоў працоўных калектываў з народнымі дэпутатамі беларускага парламента. Многіх востра хвалююць сёння пытанні, звязаныя з абаронай чалавека ва ўмовах пераходу да рынку.

Прафсаюзы рэспублікі неаднаразова настойвалі на неабходнасці прыняць заканадаўчыя акты аб працы, заработнай плаце, сацыяльнай абароне грамадзян, прафсаюзах. Але гэтая пазіцыя не знаходзіць, на жаль, падтрымкі ні ў парламенце, ні ва ўрадзе рэспублікі. І атрымліваецца так, што чалавек працы застаецца сам-насам са сваімі праблемамі ў такі цяжкі час.

Прыцягнуць увагу рэспубліканскіх органаў заканадаўчай і выканаўчай улады да карэннага вырашэння праблем па прадухіленню імклівага падзення жыццёвага ўзроўню людзей, стабілізацыі цэн і становішча на спажывецкім рынку і заклікана была сустрэча з народнымі выбраннікамі, што з'явілася лагічным працягам праведзеных у верасні Дзён адзіных прафсаюзных дзеянняў за правы і інтарэсы працоўных Рэспублікі Беларусь.

Адкрываючы сустрэчу, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі У. Ганчарык выказаў думку, з якой былі згодны многія ўдзельнікі сустрэчы: трэба шукаць і знаходзіць згоду на ўсіх узроўнях, у тым ліку і прафсаюзаў з органамі заканадаўчай і канаўчай улады. Хаця гучалі ў гэты дзень на плошчы і больш рэзкія выказванні ў адрас парламентарыяў. Работніца Мінскага аўтазавода З. Старажэцкая адзначыла, напрыклад, што на сесіях ідзе адкрытая барацьба за партфелі. Яна запатрабавала забяспечыць людзей работай, а не весці іншы раз марныя пасяджэнні.

Не абышлі выступаючыя і найвастрэйшыя праблемы, што хвалююць мільёны людзей. Народныя дэпутаты Беларусі І. Смоляр і М. Скарынін, якія нядаўна вярнуліся з Чарнобыльскай АЭС, дзе ўзнік пажар яшчэ на адным блоку, расказалі аб становішчы спраў і адзначылі настойлівую неабходнасць поўнага закрыцця станцыі.

Ішла размова і аб прыватнай уласнасці, адукацыі, ахове здароўя, аб культуры і спорце. На сустрэчы былі прыняты рэзалюцыі аб ахове інтарэсаў працоўных.

НА ЗДЫМКУ: у час сустрэчы з дэпутатамі.

ЗНОЎ АВАРЫЯ

ЗЛЫ ДУХ ЧАРНОБЫЛЯ

11 кастрычніка 1991 года ў 20 гадзін 9 хвіліна на Чарнобыльскай АЭС адбылася буйная аварыя. На электрычным генератары 2-га блока ўзнік пажар. Аварыя звязана з няспраўнасцю электрычных сістэм, што прывяло да ўзгарання вадародна-маслянай сумесі генератара. У выніку выйшлі са строю генератар № 4 і кабельная гаспадарка, абрушылася перакрыцце даху над генератарам.

Пажар быў хутка патушаны. У 20 гадзін 10 хвілін рэактар спынены. Пацярпеўшых няма. Радыяцыйная абстаноўка нармальная. Першы і трэці блокі АЭС працуюць у нармальным рэжыме.

Гэту афіцыйную інфармацыю пацвердзіла і спецыяльная рабочая група Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, узначальваемая народным дэпутатам М. Скарыніным, якая аператыўна выехала на ЧАЭС. Вось некаторыя з яе вывадаў:

Радыяцыйная абстаноўка на станцыі і вакол яе тэрыторыі не змянілася, што было пацверджана замерамі спецыялістаў рабочай групы.

Аварыі, што адбыліся на Чарнобыльскай АЭС, указваюць на неабходнасць прыняцця дадатковых мер па забеспячэнню бяспечнай эксплуатацыі станцыі.

Каб у далейшым не дапусціць пагрозы насельніцтву і тэрыторыі Беларусі ў выніку магчымых аварый на рэактарах ЧАЭС, Вярхоўнаму Савету і Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь рэкамендавана прыступіць да перагавораў па заключэнню пагаднення з Украінай, як уласнікам Чарнобыльскай АЭС, аб сумесных мерапрыемствах па вываду яе з эксплуатацыі і дэмантажу, а таксама — поўнай экалагічнай і гаспадарчай адказнасці ўласніка данай атамнай станцыі за ўсе адмоўныя вынікі, якія могуць наступіць для нашай рэспублікі пры далейшай эксплуатацыі ЧАЭС.

"Беларусаў выратуе толькі вяртаньне ў Еўропу, толькі паварот і арыентацыя на культурны Захад, а не на разбэшчаны, разбуральны, імперскі Усход. Пяць стагодзьдзяў цыніла Беларусь спачатку татара-мангольскую арду, потым агрэсіўную Маскву. Закрывала Еўропу. 500 гадоў супрацьстаяньня і вайны. Вялікую славянскую дзяржаву разбурылі толькі тады, калі расейцы аб'ядналі свае намаганьні зь немцамі. Захапіўшы Літву-Беларусь, царызм паставіў задачу зьнішчыць беларусаў як нацыю, зглуміць культуру, разбурыць беларускую цывілізацыю, зрусіфікаваць. Справу рускіх цароў прадоўжыла руская чэрнь — ленінскія бальшавікі. Акупаваўшы Беларускую Народную Рэспубліку, яны прынесьлі з сабой не толькі забойствы і "чрезвычайки", не толькі антычалавечую ленінскую ідэалогію, але і антыкультуру, хамства, распусту і п'янства, расейскае брыдкаслоўе, ляноту, нянавісьць і хлусьню. Нашае грамадзтва атручанае брыдотай бальшавізму.

Нават пабежны погляд на грамадзкія працэсы ў Расеі не павінен пакідаць ніякіх ілюзіяў аб намерах. Што б ні зьмянілася ў РСФСР — зьнікнуць бальшавікі, прыйдуць дзяржаўныя "дэмакраты", потым генералы, лібералы, "патрыёты", ахлакраты — усё роўна. Імперыялістычная палітыка Расеі, пакуль яна будзе існаваць як шматнацыянальная імперская дзяржава, ніколі не пераменіцца. У першую чаргу гэтая палітыка будзе пагражаць Беларусі і Украіне. Прычыны ў самой Расеі, у яе імперскай ментальнасьці, гісторыі, унутранай структуры. Вельмі малаверагодна, што Расея ўвогуле стане дэмакратычнай краінай".

Зянон ПАЗЬНЯК, старшыня БНФ, народны дэпутат Рэспублікі Беларусь.

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

АДКУЛЬ ЗБРОЯ?

У першым паўгоддзі бягучага года ў насельніцтва рэспублікі ліквідавана 1 115 і здадзена 609 адзінак агнястрэльнай зброі: наразной — 430, 3 кулямёты, 24 аўтаматы, 349 вінтовак і карабінаў, 55 пісталетаў і рэвальвераў, узрыўчатых рэчываў — 13,2 кілаграма, 72 375 боепрыпасаў.

МІЛАСЭРНАСЦЬ

З МІСІЯЙ МІРУ

У Беларусі пабывала вялікая група прадстаўнікоў Евангелісцкай царквы з Германіі.

Яны прывезлі дыягнастычнае медыцынскае абсталяванне, лякарствы коштам на пяцьдзесят тысяч марак. Амаль палова гасцей (а іх прыехала пяцьдзесят) у гады другой сусветнай ваявалі на тэрыторыі нашай рэспублікі. Сёння яны прыехалі з місіяй міру і пакаяння за тое, што было. Госці з Германіі пабывалі ва ўсіх абласцях, наведалі месцы былых баёў, а таксама Хатынь, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яны жылі ў сем'ях, якія атрымалі запрашэнне вясной наведаць Германію.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

● 2 279 чалавек звярнуліся ў службу занятасці Мінска, з іх працаўладкаваны 791. Прызнаны беспрацоўнымі 239 чалавек, з іх, у адпаведнасці з законам, права на дапамогу па беспрацоўю не атрымалі 56 мінчан.

● У памяшканні Інстытута гісторыі АН Беларусі пачаліся заняткі народнага універсітэта "Гісторыя і культура Беларусі" пры мінскай гарадской арганізацыі БНФ "Адраджэньне". Навукоўцы М. Чарняўскі і С. Санько прачыталі лекцыі "Каменны і бронзавы век на Беларусі" і "Язычніцтва ў духоўнай спадчыне Беларусі". А па веды прыйшлі работнікі культуры, адукацыі, рабочыя, студэнты, вучні школ.

● У сталіцы Беларусі мяркуецца перайменаваць плошчу Леніна ў плошчу Рэспублікі або Незалежнасці, праспект Леніна — у праспект Скарыны, вуліцу М. Горкага — у вуліцу М. Багдановіча. У далейшым вуліцы Мінска будуць насіць імёны Рагнеды, Рагвалода, Ефрасінні Полацкай, Гедыміна, Ягайлы.

● Пісьменнік А. Карпюк і народны дэпутат Н. Маркевіч узначалілі створаны ў Гродне дабрачынны культурна-асветніцкі фонд "Айчына". Фонд мае намер выпускаць газету, праводзіць розныя акцыі, накіраваныя на адраджэнне беларускай культуры.

АЎКЦЫЁНЫ

Шанц не толькі пазнаёміць землякоў са сваімі работамі, але і прадаць творы жывапісу атрымалі гомельскія мастакі на аўкцыёне, што адбыўся ў абласным цэнтры. Яго арганізаваў і правёў гарадскі саюз творчай інтэлігенцыі "ІНТЭЛ". Сродкі, выручаныя ад аўкцыёна, пойдуць у фонд развіцця гэтага саюза.

Здымак зроблены на аўкцыёне.

СУМНАЯ СТАТЫСТЫКА

НАРКАМАНІЯ

У Мінску на ўліку за ўжыванне наркотыкаў значацца 267 чалавек (у параўнанні з дзевяццю месяцамі 1990 года іх колькасць вырасла на 61) і яшчэ 367 — таксікаманы. З пачатку гэтага года органамі ўнутраных спраў беларускай сталіцы выяўлена 85 злачынцаў, звязаных з наркаманіяй (гэта — плюс 37 да такога ж перыяду мінулага года), прыцягнута да адказнасці 52 чалавекі. Павялічылася і колькасць ліквідаваных наркатычных сродкаў — на дзевяць кілаграмаў.

Па ацэнках спецыялістаў, асноўная крыніца распаўсюджання наркаманіі ў Мінску — прытоны, што арганізоўваюцца нарказбытчыкамі і спажыўцамі наркотыкаў.

КАНФЕРЭНЦЫІ

ЗА СВАЮ АРМІЮ

Два дні працягвалася ў сталіцы ўстаноўчая канферэнцыя "Беларускага згуртавання вайскоўцаў".

Больш ста дэлегатаў "катэгарычна асудзілі дзейнасць самазванага кіраўніцтва так званай нацыянальнай гвардыі як правакацыйную і накіраваную на дыскрэдытацыю ідэі стварэння беларускай арміі". У прынятым звароце да чарговай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі гаворыцца аб неабходнасці стварэння на Беларусі Савета Бяспекі, Міністэрства абароны і рэспубліканскай гвардыі.

РАХМАНАСЦЬ БЕЛАРУСА ДА ПАРЫ, ДА ЧАСУ

АДРАС СТАЧКОМА — ПЛЯЦ ВОЛІ

Сустрэча з Сяргеем АНТОНЧЫКАМ, лідэрам беларускага рабочага руху, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, з першага разу не адбылася: яго чакала камандзіроўка ў Польшчу. Але і ў мяне з'явіўся час, каб яшчэ раз падумаць, успомніць сёлетняе 2 красавіка, калі пра гэты рух даведалася ўся краіна.

Павышэння цэн чакалі. Першага красавіка паліцы магазінаў апусцелі. Куплялі патрэбнае і не вельмі, галоўнае, каб па старых цэнах. На наступную раніцу ў магазіны заходзілі са страхам і надзеяй. Баяліся, і не без падстаў, убачыць новыя непрымальныя для звычайнай сям'і цэны. Спадзяваліся, бо хацелася верыць: няхай па дарагой цане, але можна будзе купіць самае неабходнае. Такіх чакала жорсткае расчараванне — замест мяса з вітрын магазіна скаліліся свіныя галовы, толькі значна больш дарагія, чым раней.

Усплеск народнага гневу быў немінучы, аднак наўрад ці хто думаў тады, што адбудзецца ён у больш-менш спакойнай Беларусі, якая нават у гэты крывавы і вар'яцкі час здавалася мірнай, населенай спагадлівымі і цярплівымі людзьмі. Але пра тое, чым можа абярнуцца гэтая ўяўная рахманасць, памяркоўнасць, папярэджвала наша шматвяковая гісторыя, а таксама выдатны беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч: "...рахманасць беларуса таксама да пары, да часу. Пяройдзеш мяжу — і тваім ворагам будзе страшны чалавек. Страшны асабліва тады, калі гнеў яго спакойны і разлічаны".

2 красавіка мяжа цярпення беларускага народа была пяройдзена. Тады ў многіх узнікала пытанне: "Чаму Беларусь? Там жа жыццё было яшчэ не самым горшым у краіне?" Пры сустрэчы з С. Антончыкам я задала яму менавіта гэта пытанне.

— Думаю, — адказаў Сяргей Антонавіч, — справа ўсё-такі ў Чарнобылі. Людзі і так стаміліся жыць разам са сваёй бядой, а тут яшчэ гэтае павышэнне цэн. Колькі ж можна цярпець? Вось і адбыўся сацыяльны выбух.

Так, за пяць з паловай гадоў у нас накапіліся не толькі радыенукліды, але і боль, крыўда, а калі хочаце, то і злосць. За што? Чаму менавіта мы? Шэсць гадоў мы просім аб дапамозе, шэсць гадоў пакутуе зямля, мучацца людзі, паміраюць дзеці. Усё па-ранейшаму, і нават горш. У тыя дні мне іншы раз здавалася, што не натоўпы людзей, а боль наш затапіў вуліцы беларускіх гарадоў.

— Да другога красавіка рабочы рух у Беларусі ўсур'ёз аб сабе не заяўляў, — працягваў С. Антончык. — Але калі рабочыя спынілі работу, на прадпрыемствах былі аператыўна створаны стачачныя камітэты, выстаўлены шэраг патрабаванняў. Мы былі да гэтага гатовы. Спачатку былі выстаўлены эканамічныя патрабаванні — павышэнне зарплаты і кампенсацый, а таксама зніжэнне цэн на тавары. Паступова, не будучы задаволенымі, эканамічныя патрабаванні сталі перарастаць у палітычныя, галоўным з якіх быў роспуск Вярхоўнага Савета БССР. Аднак, нягледзячы на тое, што мы папярэджвалі рабочых, што ім проста кінуць кавалак хлеба, дабавяць грошай, якія хутка з'есць новы віток інфляцыі, палітычная частка была прайграна. І тым не менш, у гэтыя дні здарыліся дзіўныя рэчы. Нас гэтак жа, як і БНФ, вельмі доўга не хацелі рэгістраваць як грамадскую арганізацыю. Дык вось, пасля падзей другога красавіка адбыўся беспрэцэдэнтны выпадак: урад сеў за стол перагавораў з афіцыйна незарэгістраванай арганізацыяй. Мы прымусілі лічыцца з намі.

Так, тады яны прымусілі лічыцца з сабой, хаця і не змаглі на той момант дабіцца свайго. Іх лозунг недавер'я Вярхоўнаму Савету, як сіле, няздольнай рэальна дапамагчы народу і абараніць яго інтарэсы, пацвердзілі жнівеньскія падзеі. Няўдалы путч 19 жніўня 1991 года многае расставіў па сваіх месцах...

— Як вы лічыце, ці магчыма вырашыць праблемы, што стаяць перад рабочым рухам, парламенцкім шляхам, не прыбягаючы да крайніх мер, такіх, як, напрыклад, забастоўкі?

— Думаю, што не, таму што вывады з няўдалага путчу зрабілі не толькі перамогшыя дэмакраты, але і прайграўшыя камуністы. Нягледзячы на тое, што дзейнасць партыі прыпынена, партыя працягвае існаваць і дзейнічаць. Страціўшы ўладу, партыйныя функцыянеры хутка перафарбаваліся ў функцыянераў урадавых, каб зноў атрымаць магчымасць кіраваць. І партыйна-гаспадарчая наменклатура зразумела, што адзіная магчымасць гэтую ўладу ўтрымаць — хуценька прыбраць да рук былую партыйную маёмасць. Чаму сёння па-ранейшаму тармозіцца прыняцце законаў аб прыватызацыі? Былая КПСС, адцягваючы гэты працэс, імкнецца любымі шляхамі захаваць свае сродкі, і ўсе нашы спробы прыпыніць гэты працэс і, нарэшце, праз 73 гады ажыццявіць галоўны лозунг перамогшага пралетарыяту, аддаўшы заводы рабочым, а зямлю сялянам, натыкаюцца на моцнае процідзеянне. Лічу, што трэба як мага хутчэй перавыбраць парламент, каб адсеяць камуністычную большасць.

— Паколькі ў нас зайшла размова аб прыватызацыі прадпрыемстваў, як вы ставіцеся да гэтага працэсу?

— Я лічу, што не заўсёды гэта будзе дабром. Не варта забываць, што нашы прадпрыемствы сёння знаходзяцца далёка не ў аднолькавых умовах, тут, як у людзей, ёсць багатыя, а ёсць і бедныя. І калі прыватызаваць буйное прадпрыемства, ну, напрыклад, Мінскі завод халадзільнікаў, прадукцыя якога карыстаецца попытам і ідзе на экспарт, то, думаю, там пакрыўджаных не будзе. Але не трэба забываць, што ён жыве, існуе за кошт вялікай колькасці прадпрыемстваў меншых, якія пастаўляюць яму камплектуючыя і дзе справы могуць ісці далёка не так бліскуча. Так што ўсеагульная прыватызацыя можа толькі пагоршыць матэрыяльную няроўнасць у грамадстве.

— А якую пазіцыю вы займаеце ў адносінах да афіцыйных прафсаюзаў? Ці спрабавалі вы знайсці з імі агульную мову?

— Такія спробы былі. Але сама структура савецкіх прафсаюзаў такая, што яны павінны адначасова абараняць інтарэсы як простых рабочых, так і адміністрацыі. Таму вельмі часта бывае, што прафсаюзная арганізацыя выконвае "заказы" адміністрацыі на шкоду інтарэсам працоўных. Акрамя таго, ледзь ці не палову галіновых прафсаюзаў узначальваюць былыя першыя, другія сакратары райкомаў і гаркомаў партыі, якія селі ў гэтыя крэслы не для таго, каб абараняць інтарэсы рабочых, а каб працягваць існаваць у той сістэме. Дамовіцца з імі аказалася немагчыма.

— Вы толькі што вярнуліся з Польшчы. Як вы лічыце, ці можа быць карысны для нас вопыт польскай "Салідарнасці"?

— "Салідарнасці" спатрэбілася дзесяць гадоў для таго, каб з палітычнай арганізацыі стаць сапраўдным прафсаюзам. Уласна, гэта тое, да чаго імкнёмся і мы, бо галоўная наша задача — абарона правоў рабочых. Але за дзесяць гадоў работы польская "Салідарнасць" першай змагла прабіць брэш у сістэме сацыялізму, і сёння яе лідэр Валенса стаў кіраўніком дзяржавы. Вядома ж, нам лягчэй, таму што мы ўжо не першыя і можам у нечым выкарыстаць іх вопыт. Але ў нечым было лягчэй і "Салідарнасці" — іх падтрымлівала царква і інтэлігенцыя. У свой час мы таксама звярнуліся за дапамогай да беларускай інтэлігенцыі. Я хадзіў па інстанцыях і універсітэцкіх аўдыторыях, тлумачыў, што нам неабходна дапамога і падтрымка кваліфікаваных юрыстаў і іншых спецыялістаў, патрэбна метадалогія рабочага руху, прасіў прыйсці да нас на сустрэчу, запланаваную ў Доме літаратара. Тады ж апублікавалі запрашэнне з заклікам аб дапамозе ў рэспубліканскай маладзёжнай газеце "Знамя юности". На сустрэчу прыйшло 20—30 чалавек, якіх мы і раней ведалі па БНФ.

Чамусьці ўспомнілася, як рабочыя ў пачатку красавіка ішлі па вуліцах. Гэта былі ўжо не тыя людзі, якія раўнадушна слухалі, як шматлікія начальнікі ад іх імя запэўнівалі з высокіх трыбун партыю ў любві і адданасці. Ні на адну першамайскую дэманстрацыю яны не выходзілі так масава і дружна, ніколі я не бачыла столькі людзей на вуліцах Мінска. І ведаеце, іншы раз гэта было нават страшна. І вельмі важна было іх арганізаваць, растлумачыць, стрымаць, словам, надаць гэтаму выступленню арганізаваны характар. На гэты раз, дзякуй Богу, удалося.

— Як вы думаеце, ці магчыма паўтарэнне красавіцкіх падзей?

— Я думаю, што існуючая сістэма будзе рабіць усё для таго, каб адтэрмінаваць такія выступленні, прычым, самым простым спосабам — друкаваць новыя грошы. Гэта будзе працягвацца, пакуль людзі не прывыкнуць да таго, што грошай многа, але купіць на іх нічога нельга і абясцэньваюцца яны з кожным днём. І вось калі рабочыя гэта зразумеюць, а галоўн[illegible]дчуюць, вось тады і могуць [illegible]чацца новыя выступленні. Прычым, чым далей яны адкладваюцца, тым страшнейшымі могуць быць. Цяжка цяпер прагназіраваць сітуацыю, але думаю, што новыя выступленні, як бы гэт[illegible]хчэй сказаць, будуць насіць м[illegible] цывілізаваны характар, чым красавіцкія. Да таго ж, тады рабочыя дакладна ведалі, хто іх вораг, і гнеў іх быў накіраваны на партыю, а сёння, калі выступленні будуць, яны змятуць усіх — і правых, і левых, і былых камуністаў, і не апраўдаўшых надзеі дэмакратаў. Вынікі могуць быць самымі разбуральнымі. Успомніце хаця б нядаўнія выступленні румынскіх шахцёраў...

Уласна, на гэтым артыкул можна было б закончыць, але мне нечага не хапала. Не, не матэрыялу, а рэальных людзей, тых, хто ў красавіку вывеў на вуліцы рабочых, выставіў дакладныя патрабаванні. Якія яны, ды і ці былі ўвогуле? Рознае тады гаварылі — і што спявалі яны з чужога голасу, і што палітычна неадукаванымі, няздольнымі прыняць самастойнае рашэнне рабацягамі нехта ўмела кіраваў, ды і цвярозых сярод іх, хадзілі чуткі, было нямнога... Словам, я адправілася ў мінскі стачком. Займае ён усяго два невялікія пакоі ў доме на пляцу Волі. У адным з пакояў адбылася наша размова, якую мне зусім не хочацца называць інтэрв'ю, таму што члены і старшыні стачкомаў мінскіх заводаў проста расказвалі пра сваё жыццё і пакуль яшчэ не вельмі доўгую гісторыю, а я слухала і не перабівала.

З іх расказаў я даведалася, як у старшынь стачкомаў зусім яшчэ нядаўна парткомы патрабавалі спісы членаў іх камітэтаў. Расказалі мне, што на Мінскім трактарным заводзе ў дні путчу ў цэху шырспажыву зробілі наручнікі. Сенсацыя? Так. Калі, вядома, не браць пад увагу, што заказ гэты быў атрыманы заводам амаль год назад. А наручнікі — рэч патрэбная нават у краінах Захаду: хуліганы і мярзотнікі, на жаль, існуюць пры любым узроўні дэмакратыі... Сенсацыі не атрымалася, і дзякуй Богу.

Яны гаварылі, а я слухала і глядзела на іх рукі, таму што рукі іншы раз могуць расказаць больш, чым іх гаспадары. Пра рабочыя рукі паэты ў нас складалі вершы, ні адно святочнае пасяджэнне не абыходзілася без гімнаў у іх гонар. У святочныя прэзідыумы запрашалі і рабочых, а яны займалі, бывала, і высокія кабінеты, і з іх рук паступова сыходзілі мазалі, адмывалася прафесійная чарната пад пазногцямі.

З рук людзей, з якімі я гутарыла, мазалі не знікнуць ніколі, таму што іх прэзідыум і трыбуны — вуліцы і плошчы, іх кабінеты — цэхі родных заводаў, іх узнагароды — павесткі ў пракуратуру, якія той-сёй з іх перастаў рэгулярна атрымліваць толькі пасля 19 жніўня. Дарэчы сказаць, ніхто з іх, нягледзячы на настойлівыя парады кіраўніцтва заводаў, не здрадзіў сваёй справе ў гэтыя дні, калі ўсё было так незразумела і страшна, калі цяжка было разабрацца, дзе чужыя, а дзе свае, таму што пазіцыі людзей часам мяняліся хутчэй, чым надвор'е капрызнай беларускай восені. Якая яна, іх справа? Адказ на гэтае пытанне я знайшла ў зробленым адным з маіх субяседнікаў, Аляксандрам Галькевічам, "каментарыі да праекта калектыўнага дагавора": "Кожны з нас задаваў напэўна сабе пытанне: ці будзем мы жыць нармальна? І ці будзем увогуле жыць?" Будзем! Толькі трэба прымусіць лічыцца з сабой і паважаць сябе. Для таго і жывём!

Вераніка ЧАРКАСАВА.

ЯК РАТАВАЦЬ ВЁСКУ АД ГАЛЕЧЫ?

АГРАБРОКЕРЫ — ГЭТА НЕШТА НОВАЕ

У Беларусі створана акцыянерная таварыства "Беларуская аграпрамысловая біржа" (АТ "Белаграпрамбіржа"). Заснавальнікамі яе сталі 80 буйнейшых вытворцаў і перапрацоўшчыкаў сельгаспрадукцыі ў рэспубліцы. Устаўны фонд — больш 4 мільёнаў рублёў. "Белаграпрамбіржа" мае намер працаваць па некалькіх напрамках: сельскагаспадарчая прадукцыя і харчовыя тавары, сельскагаспадарчая тэхніка і абсталяванне, сыравіна і матэрыялы. Па кожнаму з напрамкаў таргі будуць ажыццяўляцца ў сваім сектары. Акрамя таго, створаны сектар аўкцыёнаў, аб'ектамі продажу ў якім стануць арыгінальныя сельскагаспадарчыя тэхналогіі, якія распрацоўваюцца ў даследчых інстытутах.

Чым выклікана нараджэнне біржы? На гэтае пытанне адказвае сустаршыня біржавога савета **Аляксандр ДЗЯХЦЯР.**

— Рынак канчаткова не ўведзены, але асновы яго закладзены. Думаю, што адну з галоўных роляў у яго зацвярджэнні ў далейшым павінны адыграць сельскагаспадарчыя структуры. Прамысловасць ужо цяпер мае магчымасць прадаваць сваю прадукцыю ці хаця б частку яе па рынкавых цэнах, а сельскагаспадарчыя калектывы аб продажы звышпланавай прадукцыі паводле свайго меркавання толькі мараць. Хаця і прынята на гэты конт нямала добрых і правільных дакументаў. На самай справе прыбытак калгасаў і саўгасаў цяпер катастрафічна змяншаецца (пра гэта многа ўжо гаварылася на ўсіх узроўнях), ідзе занядбанне сяла. Стаўка на фермера таксама пакуль не спраўджваецца.

Вось і вынік. Калі па Беларусі прыбытак у прамысловасці за год вырас у два разы, то ў сельскай гаспадарцы ён рэзка ўпаў. Гэта ненармальная з'ява.

Каб хоць неяк папраўіць становішча, Саюз аграрнікаў Беларусі, знайшоўшы разуменне ў Вярхоўным Савеце і Савеце Міністраў рэспублікі, дабіўся таго, што 10 працэнтаў сваёй прадукцыі калгасы і саўгасы будуць рэалізоўваць па свабодных цэнах.

Вядома, можна адкрыць у горадзе ўласныя ларкі, магазіны, універсамы і там прадаваць сельскагаспадарчую прадукцыю. Але для сялян гэта няздручна, і дзе ўзяць абсталяванне, штат прадаўцоў? На якія грошы іх утрымліваць? Больш затраціш, чым атрымаеш прыбытку.

Лепш звярнуцца да паслуг біржы, заключыць дагавор з брокерскай канторай на абслугоўванне і прадаць свае лішкі оптам, па рынкавых цэнах, якія вызначаюцца попытам. Таму Саюз аграрнікаў Беларусі вырашыў стварыць Беларускую аграпрамысловую біржу. І вось яна існуе.

— Хто яе заснавальнікі?

— Гэта перш за ўсё Саюз аграрнікаў, Беларускі сялянскі саюз, Беларускі сялянскі ашчадны банк, Белаграбанк, Міністэрства сельскагаспадарчай прадукцыі, калгасы "Рассвет", "Савецкая Беларусь" і інш. У кіраўніцтве біржы 26 чалавек. У рэспубліцы і за яе межамі створана пакуль 150 брокерскіх кантор, якія будуць дзейнічаць пад кантролем савета. Ён жа вызначае і палітыку біржы, умовы для біржавых аперацый. Апрача абаронча-прадстаўнічых функцый, ён, відаць, будзе арбітрам у выпадку канфліктных сітуацый.

Рыгор КОЛАБАЎ.

161

Няўжо ён не атрымае іх...“ Эх, цяпер-бы прыгожую дзяўчыну, назло Вярхоўскай,“ — думаў ён. Назло сваім змучаным нагам ішоў бяз мэты па Празе. Начныя жанчыны на кожным кроку сулілі яму сваё каханьне. Ён з жахам уцякаў ад іх. Яны хрыпелі нейкімі мужчынскімі галасамі, яны былі бледныя й страшныя, як сама сьмерць...

Было ўжо каля гадзіны ночы, калі ён пабачыў, што ўсе яго блуканьні й шуканьні жанчыны не дадуць ніякіх вынікаў. Ён павярнуўся дахаты. Шумнае Вацлаўскае намнесьці (Вацлаўская плошча ў Празе) засталося далёка ззаду. Ён выйшаў у далёкі цёмны правулак, злучаўшы шумнае намнесьці з другой шумнай вуліцай. Ішоў, пільна ўглядаючыся ў цемру. У правулку гарэў адзін маленькі газавы ліхтар. Тугоўскі ўглядаўся, каб дзе-небудзь не спаткнуцца. Як раптам ён нават спыніўся ад зьдзіўленьня. Праз самую асьветленую частку правулка ляцела з голай галавой у аднэй блузцы жанчына. Яна ляцела досыць доўга, й потым, відаць, у яе не хапіла сілы, і яна прытулілася да цёмнай сьцяны дому. “Якая-небудзь трагэдыя, — падумаў Тугоўскі. — Зімой аднэй блудзіць і з голай галавой — гэта што-небудзь знача“. Ён пасьпяшыў на дапамогу спынілаўшайся жанчыне.

— Што з вамі? — спытаў ён, падходзячы да яе... Жанчына маўчала. Толькі чулася яе парывістае дыханьне. — Што з вамі? — паўтарыў пытаньне Тугоўскі.

— Ох, — толькі праенчыла яна ў адказ. — Ох, мне дрэнна.

— Вы хворая? — спужаўся Тугоўскі. — Што з вамі, кажыце.

— Ох, не магу. Я зараз завалюся. Паглядзіце,

162

як б'ецца маё сэрца.

Ён пачаў шукаць яе сэрца. Алкаголь прымушаў яго качацца, як матроса на параплаве, й пакуль ён рукой папаў на належнае мейсца, прайшло нямала часу. Яна енчыла, пакуль яго рука блукала па яе целу, й нарэшце замоўкла.

— Што з вамі? — яшчэ раз запытаў Тугоўскі, трымаючы руку на яе сэрцы. Яму было прыемна й цёпла ад гэтага дотыку да маладой стройнай, як ён мог прыкмеціць у цемнаце, дзяўчыны. Твару яе ён ня бачыў.

— Я зараз жа пабягу да тэлефону, пазваню за карэтай Чырвонага Крыжа.

— Ох, ня трэба, — праенчыла яна. — Нічога ня трэба... Адвядзіце мяне толькі дахаты.

— З прыемнасьцей, — прамовіў ён. Яна апёрлася ўсім сваім целам на яго руку. Ціхім крокам яна ледзь рухалася побач з ім й цяжка дыхала. Тугоўскі маўчаў. Ён вёў яе, як дарагі скарб, — з сьвядомасьцей важнасьці свайго паступка. Як будуць уцешаны яе бацькі, калі ён прывядзе яе дахаты. Як будуць удзячны яны Тугоўскаму, як будуць паціскаць яму руку, паставяць гарбаты, будуць запрашаць яго, й хто ведае, можа быць ён стане запраўды іх госьцем... Ён увойдзе ў чэскае грамадзянства. Дзяўчына — прыгожая. Ён стаў поўны фантазій й акрыляўшага яго посьпеху. Хутка-хутка ён пабачa яе бацькоў.

— Вам далёка яшчэ да хаты? — запытаў ён, нахіліўшыся да яе.

— Не, — прамовіла яна. — Зараз будзе, — і пайшла значна болей бадзёра. Правулак канчаўся. У канцы яго бачыўся заліты сьветам дом і шумная вялікая вуліца. Дзяўчына раптам пайшла зусім бадзёра. Яна сьціснула руку настолькі моц-

163

на, што ён зьдзіўлена паглядзеў на яе. Яны пайшлі да залітага сьветам дому. Правулак кончыўся.

— Ну цяпер куды? — спытаў Тугоўскі. — Далёка да вашага дому?

— А вось ён, — паказала яна на асьветлены дом.

— Тут? — са зьдзіўленьнем спыніўся Тугоўскі і вырваў сваю руку з рукі дзяўчыны. Ён нават адступіў некалькі крокаў назад. На дзявярох дому было напісана: “Рэстаран“.

— Гэта ваш дом, вы тут жывяце? — спытаў няверучы сваім вачам.

— Так, — засьмяялася яна. — Пойдзем... Сумаваць ня будзеце.

— Дык вось як, — вырвалася з вуснаў Тугоўскага. — А я думаў...

— ...што я хворая? — засьмяялася яна. — Ну нічога, мой хлопчык, мой студэнчык. Вы, я бачу, студэнт. Па вашаму акцэнту чую, што ня чэх. Што ж, зайдзем. Студэнты мае частыя й каханыя госьці. — Яна ўзяла яго пад руку. Ён пярэчыў слаба. Ён спомніў, як яму было прыемна, калі ён шукаў яе сэрца... Ён першы раз слухаў жаночае сэрца. Алкаголь рабіў свае ўплывы на яго разьбітае, не пасьпеўшае расквесьці каханьне... Эх, што будзе, то будзе. Ён увайшоў з сваей паненкай. Высокі, выцягнуўшыся ў струну, лёкай паказаў ім дарогу ўніз па шырокай драбіне, засланай чырвоным каберцам. Яны прайшлі міма ў невялікі і шоўшы паўкругам пакой, абіты сьветла-нябеснымі шпалерамі, пасярэдзіне якога стаяў круглы чорны столік, удоўжань сьцяны выцягнуўся мяккі дыван. За сьцяной аслабявала і ўсё шырылася пьяная музыка...

Не пасьпелі яны зачыніць за сабой дзьверы, як

164

у пакой зайшоў лёкай, той самы, што паказываў дарогу, й паставіў паднос з бутэлькай віна й бакаламі на стол. У тую самую мінуту ён моўчкі працягнуў Тугоўскаму рахунак на крупную суму ў сто чэскіх карон. Як ня быў ахоплены флэкаўскім півам Тугоўскі, ён зразумеў, што ўся гэта бутэлька ня варта гэтых грошаў. Ён рашуча запратэставаў...

— Гэта самы лепшы партайн, — прамовіў ласкава лёкай.

— Мілы! — абвіла паненка за шыю рукамі. — Сорам было-б займацца гэтай сумай.

Тугоўскі перастаў пярэчыць, выцягнуў партманэ і паклаў на паднос зялёненькую паперку у [illegible] крон.

— Ого, у цябе шмат грошаў, — прамовіла паненка, заглянуўшы ў яго партманэ: — Купі мне папірос.

Лёкай, не чакаючы адказу Тугоўскага, зараз выцягнуў з кішэні фрака пачку папірос. Тугоўскаму гэта не падабалася. Усё ж ён не такі п'яны быў, каб не зразумець, што з ім робяць нешта нядобрае. Але, не жадаючы больш спрачацца, ён моўчкі заплаціў за папіросы. Нарэшце яны засталіся адны. Лёкай пасьпяшыў выйсьці. Можна было ім рабіць, што яны жадалі. Яны былі схаваны ад усіх людзей, ад усяго сьвету, ад усіх маральных законаў. З кожным выпітым бакалам ён рабіўся больш і больш прагавітым да ласкі, да жанчыны, каторую ён шукаў цэлае жыцьцё, а яна рабілася больш студзёнай, мармуровай... Яна сьмяялася студзёным каменным сьмехам.

— Ну, цалуй мяне, мой мілы студэнчык... Бяры маё сэрца.

Але ні адзін мускул яе не ажывіўся, ні адна частка цела яе не магла жыць, не магла адчуваць.

165

Ён цалаваў мяккі студзёны камень, і пакуль у яго яшчэ была памяць, ён адчуваў нейкае незадавальненьне. Але потым усё стала яму прыемным. Потым зілось усё ў густы туман.

Калі ён прабудзіўся, ён убачыў, што ўжо сьвет льецца адкульсьці з вышыні вузкай паласкай. Праз вузкую паласку шкла ў столі віднеліся ногі праходзіўшых па вуліцы, шыны аўтамабіляў, фурманак. Жыцьцё кіпела, вуліца рухалася, як велізарны мурашнік, ні на мінутку не спыняючы сваёй бегатні. Дзесь было змаганьне, была чэсная праца, дзесьці біліся за істнаваньне людскае, а ён ляжаў, згубіўшы ўсякае разуменьне аб прастору, аб часу, аб тым нават, дзе ён. Як папаўся ён сюды? Ён ускочыў на дзіване і пачаў шукаць тую, якая прыняла яго ў гэты пакой. Яе і сьлед прастыў. Ён з жахам схапіўся за сваё партманэ. Толькі два даляры сіратліва ляжалі сярод дакументаў. Тыя грошы, якія ён атрымаў у лік стыпэндыі за паўтара месяца, зьнiклі невядома як, толькі адны ўспаміны ў відзе рахункаў, напісаных алавіком, сьведчылі аб іх колішнім істнаваньні. Ён схапіўся за галаву. Што ён будзе рабіць зараз у Празе з двума далярамі? І як ён паедзе цяпер на Бацькаўшчыну? Што ён нарабіў?

Ён ускочыў з дывану. Трэба шукаць каго-небудзь, трэба атрымаць тлумачэньне. Ён выйшаў з пакою, падняўся па драбіне з чырвоным каберцам, заглянуў у розныя пакоі, але нідзе не нашоў ніводнай душы: здавалася, што гэта быў нейкі загавораны дом. У адным пакою ён убачыў нейкую тоўстую бабу з закасанай спадніцай, мыўшай падлогу.

— Вам што трэба? — запытала яна.

— Я шукаю адну паненку, — пачаў Тугоўскі.

166

— Ніякай паненкі тут няма. Я тут адна. — Яна павярнулася й хлопнула перад яго носам дзьвярмі. Ён стаяў і раздумываў. Раптам нешта кальнула яго. Ён ледзь не прысеў ад болі. Заразіўся! Студзёны пот выбіла на чале. Задрыжэлі рукі і ногі. Ён сеў на стаяўшае зблізу стула. Галаву калола неадступная думка: “Схапіў дурную хваробу. Першы раз у сваім жыцьці прытуліўся да жанчыны, згубіў нявіннасьць дзеля таго, каб згубіць усё жыцьцё. Як дзіка! Хутчэй адсюль...“ Ён апрануў сваё зімовае пальто й выйшаў на вуліцу. З жахам заглянуў ён на гэты дом, дзе было напісана “Рэстаран“ і дрыжачаю рукой запісаў адрас: калі-небудзь, калі можа быць выявіцца запраўды, што ён атрымаў дрэнную хваробу, ён пацягне рэстаран да судовай адказнасьці. “Хаця, — падумаў ён зараз жа, — што я магу зрабіць з рэстаранам. Ён скажа, што я прывёў дзяўчыну з вуліцы, а за гэта ён ня можа нясьці адказнасьць. Як дзіка! Як страшна! Мала таго, што няма грошаў, але няма больш чыстаты, няма здароўя. Ён будзе хадзіць з праваліўшымся носам. Ах, хоць-бы мінула яго гэтая кара“. Ён ляцеў, як непрытомны, у інтэрнат, спадзеючыся, што там знойдзецца нямала спецыялістаў па вэнэрычных хваробах. Але каго запытаць?

У інтэрнаце яму папаўся сьпявак Серада, чалавек, у каторага не кожны дзень бываў палудзень, чалавек, каторы жыў тым, што хадзіў па рэстаранах й падчас абеду падсаджваўся да сваіх сябровў,

Працяг.
Пачатак у №№ 23 — 42.

167

сьпяваючы ім свой сібірскі раманс: “Ах, Соня, мая чэска Соня“. Гэты чалавек, зразумела, ведаў аб розных хваробах. Але запытаць яго, каб ён расказаў з насьмешкай па ўсяму інтэрнату, што ў Тугоўскага дрэнная хвароба, было-бы глупствам. Ён зьвярнуўся да астральнага чалавека:

— Скажыце, як зьяўляецца сіфіліс?

— А што? — зьдзівіўся астралёг. — Чаму вас гэта зацікавіла? Схапілі?

— Ня ведаю, — чырванеючы, сказаў Тугоўскі.

— Хвароба зьяўляецца на другі тыдзень, — сказаў астралёг, — зьяўляюцца падазроныя гнойныя плямы.

— Ах так... Дзякую... — І ён супакоены пайшоў хадзіць па карыдоры.

Ён нідзе ня мог знайсьці мейсца. Што нарабіў ён, што будзе зараз з яго паездкай на Бацькаўшчыну, з яго апрашчэньнем? Ён зьбіраўся ехаць чыстым ідэальным юнаком, а зараз ён павязе з сабою бруд, ён павязе з сабой жахлівую хваробу вялікага места. Фактычна ён ніскольκі ня лепш за тых, на якіх ён нападаў, як на кар'ерыстаў, буржуазных “інтэлігэнтаў“... Ён брудны, нягодны, нявартны насіць імя чалавека.

Ён доўга лаяў сябе і доўга хадзіў па карыдору інтэрнату. Але нарэшце холад прымусіў яго вярнуцца да рэчаітасьці і ўспомніць пра палудзень. Аднак на гэты раз задаволіўся толькі адной сарбанкай з хлебам і ўвесь апошні дзень праляжаў як хворы ў пасьцелі.

X

У гэты самы час беларускія студэнты безупынку

168

грызьлі граніт навукі. Іх мала відалася ў Студэнцкім доме, мала й рэдка яны спыняліся для гутарак і толькі па некалькі хвілін пасьля палудня дзяліліся ўражаньнямі ад экзаменаў. Момант быў вельмі сур'ёзны. Канчалася зіма, у паветры ўжо насіліся цёплыя вясновыя вятры, прафэсары заканчывалі чытальныя курсы другога, апошняга семестру. Адны студэнты павінны былі прайсьці на наступныя курсы, другія ўжо падыходзілі да дыплёмных прац і дактарату. Праца кіпела. Нават хто цэлы год гуляў па Празе, больш паглядаючы за яе цікавасьцямі, чым за навукай, то ў апошні момант схапіўся, каб вярнуць загубленае. Пачыналіся запраўды скокі з перашкодамі. У гуртах зьбіраўшыхся хто - небудзь заўсёды апавядаў сьмешныя выпадкі, як валіліся студэнты.

— За кожны экзамен трэба было плаціць грошы. Так што правам: “Мяне ўжо зазначыў высокі турак“, — другі раз не пакарыстаешся. Касір на тэхніцы ўсіх ведае па прозьвішчу. Як толькі я прыходжу плаціць грошы за экзамен, ён голасна пытае мяне: “Вы ізноў праваліліся на экзаменах?“

Студэнты хахаталі.

— А прафэсары, грамадзяне, — сьмяяўся маленькі чорненькі тэхнік Жук, — ужо робяць скідкі: бяруць толькі два разы за экзамен. На трэці раз студэнт ідзе ўжо экзаменаваць бясплатна.

— Не махлюй, — казаў абражаны Бурак пад хохат.

— Ну, вось, скажы ты мне, — запытаўся яго насьмешліва Кірыла, — ты здаваў зоолёгію?

— Здаваў.

— Ну вось скажы тады: анёба будзе такая? — Ён расшырыў рукі на чвэрць аршына.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ЭМІГРАЦЫІ

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ У НЬЮ-ЙОРКУ

Аб рабоце Беларускага інстытута навукі і мастацтва (БІНіМ), што месціцца ў Нью-Йорку, па просьбе рэдакцыі газеты "Голас Радзімы" расказвае яго дырэктар Вітаўт КІПЕЛЬ.

Думка аб стварэньні навукова-дасьледчае ўстановы на эміграцыі выказвалася ўжо ў Нямеччыне напрыканцы саракавых гадоў. Справа ў тым, што на эміграцыі па другой сусьветнай вайне апынуліся сотні беларускіх навукоўцаў, настаўнікаў ды наогул людзей з вышэйшай асьветай. Былі гэта пераважна асобы зь Менску ды зь Вільні, якія перад вайной займаліся навукова-дасьледчай працай. Аднак зрэалізаваць гэтую ідэю ў Нямеччыне ня было магчымасьці — Нямеччына-ж была для нас толькі пераходнай астаноўкай перад няведамай будучыняй. Калі-ж бальшыня беларускіх эмігрантаў з Заходняе Нямеччыны напрыканцы саракавых — пачатку пяцьдзесятых гадоў перабраліся ў Злучаныя Штаты Амэрыкі, было відавочна, што тут, як выглядала, у краіне пасяленьня, гэткую ўстанову ці арганізацыю закласьці ўдасца. Ініцыятары гэтага праэкту пачалі рабіць арганізацыйныя крокі ў 1950-м годзе. Піянерамі былі д-р Вітаўт Тумаш, Янка Ліманоўскі (некалі — старшыня БЕЛАПУ), уладыка Васіль (у цывільным жыцьці Ул. Тамашчык), прафэсар Мікола Дарашэвіч (перад вайной выкладаў, здаецца, у БДУ) ды некалькі іншых асобаў. Актыўна падтрымвала гэтую ідэю і спадарыня Натальля Арсеньнева. Адным з актыўных ініцыятараў арганізацыі Інстытуту быў таксама прафэсар Л. Акіншэвіч.

У 1951 годзе арганізацыя была закладзеная. Мэтай арганізацыі было: згрупаваць беларускія інтэлектуальныя сілы, пісьменьнікаў, ды наагул людзей, якія цікавіліся дасьледваньнем беларусаведы. Гэтаксама арганізатары Інстытуту мелі на ўвазе даць магчымасьць дасьледнікам друкаваць свае дасьледваньні, а пісьменьнікам даць часапіс, дзе друкаваліся-б літаратурныя творы. Вялікую ўвагу зьвярнулі арганізатары Інстытуту на актывізацыю беларускага інтэлектуальнага жыцьця — арганізацыі навуковых лекцыяў, выставак, юбілейных адзначэньняў, літаратурных вечароў і г. д.

Фінансаваньне дзейнасьці арганізацыі ў статуце Інстытуту прадбачвалася праз сяброўскія складкі і адвольныя датацыі, а таксама праз продаж друкаў, ды шуканьне розных стыпэндыяў (па-амэрыканску "грантс", ці то датацыяў ад розных дапамаговых арганізацыяў). У асноўным фінансавая база Інстытуту захавалася бязь зьменаў. З гадамі Інстытут меў філію ў Нямеччыне (самазьліквідавалася) і ў Канадзе, дзе Інстытут дзейны і да цяперашняга часу.

Пастунова мяняўся і асабовы склад Інстытуту. Калі напачатку ў арганізацыі былі асобы, якія здабылі вышэйшую асьвету на бацькаўшчыне, дык ад сярэдзіны пяцьдзесятых гадоў сяброўства Інстытуту павялічылася за кошт маладзейшых кадраў, якія атрымвалі асьвету на Захадзе. Адным зь першых, маладзейшых беларускіх дасьледчыкаў, хто стаў актыўным членам Інстытуту, быў, прыкладам, доктар Аўген Вярбіцкі (нядаўна памёр) — выдатны біяхімік, піянер дасьледваньня іррадыяцыі ў харчовай прамысловасьці, які шмат працаваў у амэрыканскай праграме дасьледваньня космасу ды арганізацыі харчовае базы пры палётах на Месяц. Напрыканцы-ж пяцьдзесятых гадоў у Інстытуце было ўжо па-над чвэрць маладзейшых членаў. (Дарэчы, членства Інстытуту вагалася ад пару сотняў асобаў да 100—120).

З прыходам маладзейшых кадраў пастунова пашыраліся рамкі дзейнасьці арганізацыі. Інстытут пачаў уваходзіць у блізкія кантакты з амэрыканскімі унівэрсытэтамі, арганізацыяй амэрыканскіх славістаў, браць удзел у амэрыканскіх канферэнцыях, быць дараднікам у арганізацыі бібліятэчных калекцыяў, наагул, працоўныя сувязі Інстытуту значна пашырыліся. Пачалі зарысоўвацца і асноўныя, мацнейшыя, аспэкты дзейнасьці Інстытуту. Інстытут пачаў, найбольш дзякуючы ініцыятыве доктара Тумаша, зьбіраць Скарыніяну, дзякуючы дзейнасьці д-ра Запрудніка дакумэнтаваньне навейшае беларускай гісторыі — ад Дзяржаўнае Думы да БНР, Вітаўт і Зора Кіпелі пачалі бібліяграфічную картатэку Інстытуту: беларусіка ў ангельскай мове і гісторыя беларускай эміграцыі ў Амэрыцы. Дарэчы, картатэкі гэтыя вядуцца і цяпер. Распачаў Інстытут друкаваць і новыя сэрыі друкаў: Беларускія паэты і пісьменьнікі і сэрыя бібліяграфічных працаў (прыклады апошняе — Купала і Колас на Захадзе, Беларуская Дзяржаўнасьць, Пяць стагодзд[illegible] Скарыніяны).

Але асабліва шмат зрабіў Інстытут для папулярызацыі беларускае культуры ў амэрыканскія энцыклапедычныя выданьні, даведнікі, падручнікі. Прыкладам, адным з апошні[illegible] гэткіх "выпадкаў" — гэта арт[illegible] Зоры Кіпель у Энцыклапед[illegible] Артурыяну аб Беларускім Трыстане (артыкул выдрукаваны ў 1991 годзе).

Найчасьцей Інстытут выкарыстоўвае для сваіх зборак памешканьне гарадзкога каледжу ці то на 42-й вуліцы, ці то ў Квінс Каледж. Аднак пэрманэнтная база Інстытуту (бібліятэка і архівы) будзе ў фундацыі Пётры Крэчэўскага, куды Інстытут пачаў перабірацца.

Цяпер пра кіраўніцтва Інстытуту. Старшынямі БІНіМ былі япіскап Васіль, Янка Ліманоўскі, д-р Вітаўт Тумаш, Антон Адамовіч, а ад 1982 году старшынём зьяўляецца Вітаўт Кіпель.

Асноўная накіраванасьць адміністрацыі Інстытуту (рада дырэктароў — Вітаўт Кіпель, Ян Запруднік, Зора Кіпель, Антон Шукелойц, Антон Адамовіч і д-р Вітаўт Тумаш) наладзіць сталы выхад англамоўна-беларускамоўнага часапісу, ды прыдбаць у члены Інстытуту маладзейшых асобаў. Зараз у Інстытуце па-над трыццаць маладых людзей, якія ўжо народжаныя не на Беларусі. За апошняе дзесяцігодздзе членамі Інстытуту сталася таксама каля дзесятка дасьледнікаў беларусазнаўства небеларускага паходжаньня.

Адзначаючы сёлета саракагодздзе БІНіМу, аб'ектыўна трэба сьцьвердзіць, што гэтая арганізацыя зрабіла шмат як для папулярызацыі імя і культуры Беларусі ў Амэрыцы і наагул на Захадзе (Інстытут быў запрошаны ў Францыю і Англію для супольных працаў), гэтак шмат зрабіў Інстытут і ў беларускіх дасьледваньнях. Апошнімі гадамі Інстытут наладжвае вельмі пасьпяховае супрацоўніцтва з беларускімі дасьледнікамі ў Беласточчыне і на Бацькаўшчыне, што, бясспрэчна, будзе спрыяць беларусаведзе ды духоваму яднаньню беларусаў дыяспары з Беларусьсю.

НА НОВЫХ ЗЕМЛЯХ

Гэтыя дзве сям'і — Грыцкевічы і Вылеўкі — вярнуліся на родную беларускую зямлю пасля больш чым дваццацігадовага пражывання ў Латвіі. Працавалі яны ў калгасе "Ленінскі сцяг" Екабпілскага раёна — моцнай многанацыянальнай гаспадарцы. Аляксандр Грыцкевіч пачынаў механізатарам. Затым быў майстрам-наладчыкам, механікам, брыгадзірам трактарнай брыгады. Вацлаў Вылеўка асвоіў прафесію вадзіцеля, мог выконваць і зварачныя работы. Працавалі сумленна. А таму людзьмі былі ў калгасе паважанымі, жылі заможна, мелі добрыя дамы, моцнае падвор'е.

Мелі... Пакуль не пачаліся ў Латвіі перамены, у выніку якіх тым, хто прыехаў сюды пасля Вялікай Айчыннай вайны, заставалася толькі адна дарога — у батракі. Тут і аказалася дарэчы знаёмства Грыцкевіча і Вылеўкі са старшынёй калгаса імя Дзімітрава Глыбоцкага раёна Мікалаем Януковічам. Раней ён часта наведваўся па справах у "Ленінскі сцяг". Запрасіў працавітых землякоў працаваць у сваёй гаспадарцы. І справу вызначыў: вырошчваць парасят.

— Парасяты на рынку дарагія, а жадаючых купіць іх у гаспадарцы нямала. Жыццё падказала, што трэба наладжваць уласную справу, — тлумачыць Януковіч.

А жыць прапанаваў на хутары, размешчаным у маляўнічым месцы, дзе былі і сажалка, і стары сад. Некалі гэта была памешчыцкая сядзіба, раслі пладовыя дрэвы рэдкіх сартоў. З часам усё занепала. І тым не менш пасяліцца тут знаходзілася многа ахвотнікаў. Ды толькі бачыў старшыня: як правіла, прыходзілі людзі без якіх-небудзь канкрэтных планаў. Так, каб проста "забіць" зямлю. Грыцкевіч і Вылеўка былі не з такіх.

Першыя ўражанні ад хутара ў навасёлаў аказаліся невясёлымі: усё ляжала ў руінах.

— Вялікае дзякуй калгасу — дапамог нам у будаўніцтве дома, і ў добраўпарадкаванні сядзібы, — гаворыць Грыцкевіч. — Першай нашай жыўнасцю стала галка Даша. Як толькі прыехалі, прыручылі яе, і яна не пакідае двор. Цяпер у нас невялікая свінаферма. Хутка пачнём прадаваць парасят насельніцтву. Ёсць трактары, праўда, спісаныя, але яшчэ на хаду. Пачалі разводзіць пчол. У перспектыве плануем пабудаваць ферму для буйной рагатай жывёлы. Даходаў паку[illegible]ма, але верым, што ўсё павінна ісці да леп[illegible]

Як і ўсе першапраходцы, гэтыя фермеры [illegible]таныя ідэяй. Яны вераць у свае сілы і ў той час, калі не батракамі, а сапраўднымі гаспадарамі зямлі стануць тыя, хто на ёй працуе.

НА ЗДЫМКАХ: навасёлы калгаса імя Дзімітрава муж і жонка ГРЫЦКЕВІЧЫ і ВЫЛЕЎКІ; і дапамога васьмідзесяцігадовай [illegible] ВЫЛЕЎКІ вельмі патрэбна ў новай гаспада[illegible]; а цяпер на хутары цэлы птушыны статак.

Фота А. ТАЛОЧКІ.

АКЦЫЯ «ДЗЕЦІ ЧАРНОБЫЛЯ» ЗАВЕРШАНА

Згодна з дагаворам ад 17 студзеня гэтага года, падпісаным паміж польскай інстытуцыяй "Карытас" і пяццю дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі Беларусі, чатыры тысячы дзяцей з раёнаў, апаленых Чарнобылем, адпачывалі ў час летніх канікулаў у польскіх каталіцкіх сем'ях. З гэтай колькасці 720 чалавек прыехалі з Бабруйска і Гомеля. Дзеці гасцілі ў Ольштыне, Ожышу, Фрэдновах, Шчытне...

Вялікі клопат па ўладкаванню беларускіх ахвяр ядзернай катастрофы ўзялі на сябе пані Ірэна Мусял і ксёндз Браніслаў Сіекіерскі. Большасць сем'яў, якія прынялі дзяцей на месячны адпачынак, — небагатыя людзі, пенсіянеры. Найважней, каб прыязджалі беларускія дзеці з сем'яў з невялікім дастаткам, а не з тых, чые бацькі ў гэты ж час на Чорным моры загараюць.

Леташняя акцыя "Дзеці Чарнобыля" — чыстае паветра і адкрытыя сэрцы — скончана. "Карытас" падбівае яе рахунак, каб актывізаваць сваю дзейнасць у гэтым кірунку на будучыню.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК.

Польшча.

АБ'ЯДНАЛА ЛЮБОЎ ДА ПЕСНІ

Ад дваццаці да сямідзесяці гадоў — узрост удзельнікаў фальклорна-этнаграфічнага ансамбля "Астранка" з вёскі Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна. Аб'яднала гэтых людзей любоў да народнай песні. У рэпертуары калектыву — больш за сорак мелодый. Але далёка не вычарпана фальклорная крыніца, бо вёска Стары Дзедзін адзначыла нядаўна сваё тысячагоддзе. А таму будзе папаўняцца рэпертуар і надалей.

НА ЗДЫМКУ: фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Астранка".

Фота В. АЛЯШКЕВІЧА.

«АПОШНІ СВОЙ СКАРБ АДДАЮ»

ДА 100-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Максіма БАГДАНОВІЧА

З публікацый Т. Кароткай "Тут нараджалася слова" ("Голас Радзімы", 1983, 15 верасня) і "Радок у біяграфію паэта" ("Літаратура і мастацтва", 1983, 7 кастр.) стала вядома, што чатырохгадовы Максім з братамі Вадзімам і Лёвам разам з маці правёў вясну і лета 1895 года ў сваёй цёткі Сцепаніды Апанасаўны, муж якой Франц Секержыцкі служыў аб'ездчыкам непадалёк ад чыгуначнай станцыі Асіповічы. Відаць, "гродзенскіх" і "асіповіцкіх" уражанняў для таленавітага дзіцяці было дастаткова, каб далучыцца душою да роднага краю. Ракуцёўскае лета 1911 года было таксама не эпізодам, а важным этапам у жыцці паэта-юнака. Бо ўжо праз год пасля гэтай падзеі ён прыслаў у рэдакцыю "Нашай нівы" рукапіс "Кніжкі выбраных твораў" — амаль гатовы паэтычны "Вянок".

Ці пад сілу быў гэты подзвіг зусім маладому паэту, які, паводле меркаванняў даследчыкаў, вывучаў родную мову па лексічных і фальклорных зборніках? Хутчэй за ўсё адбылося нешта іншае: у раннім дзяцінстве маці-Беларусь "запісала" сваю мову на чыстых лістах уражлівай душы свайго сына, напявала яму свае песні і казкі ў сне, пазначыла крыжам хрышчэння на любячым сэрцы дзіцяці. А другое, сталае хрышчэнне адбылося летам 1911 года ў Вільні і Ракуцёўшчыне: прычашчэнне духоўным вінам Бацькаўшчыны.

Відаць, даследчыкі прынялі за кніжнае вывучэнне роднае мовы волатаўскую працу над словам — рэч звычайную і штодзённую для кожнага прафесійнага паэта. Не варта браць на веру меркаванне В. Ластоўскага ("Мае ўспаміны аб М. Багдановічу", — "Літаратура і мастацтва", 1989, 22 лістап.), быццам бы тады, у 1911 годзе, "мову М. Багдановіч знаў яшчэ дрэнна і, гаворачы, збіваўся на маскоўшчыну". Майстэрства вуснага маўлення залежыць хутчэй ад штодзённай практыкі, ад жывога сумоўя, а не ад глыбіні пазнання мовы. Сёння майстры беларускага слова, штодзённа жывучы ў рускамоўным асяроддзі БССР, якое запанавала нават у іхных сямейках, часта-густа "збіваюцца на маскоўшчыну", непрыемна ўражваючы школьных настаўніц. І гэта цяпер, калі, скажам, у нашым Доме літаратара альбо на філалагічным факультэце можна пачуць чыстую беларускую гаворку. А для аўтара "Вянка" наогул не было куды пайсці, каб заглянуць на "адзенне душы" аднамоўцы і па ёй скарэкціраваць сваё беларускае маўленне. Вось у якіх умовах стваралася "зачараванае царства" ягонай паэзіі!

Далучэнне Максіма Багдановіча да "нашаніўскай" паэзіі пачалося з адраджэнскай сімволікі. Яму, малодшаму сучасніку Купалы, Коласа і іх паслядоўнікаў, у гэтай галіне належыць бясспрэчны прыярытэт. Прыйшоўшы ў літаратуру некалькімі гадамі пазней за сваіх настаўнікаў, ён не толькі шчасліва пазбегнуў [illegible]ігонства, але з першых жа па[illegible]ых крокаў стаў наперадзе іх [illegible]а "сімвалічным" участку нацыянальнай літаратуры, якая яшчэ толькі стваралася. Успомнім: першы твор М. Багдановіча апавяданне-эскіз "Музыка" друка[illegible]ўся 6 ліпеня 1907 года ў "[illegible]й ніве". Толькі яшчэ пачына[illegible] трэцяя хваля нацыянальнага Адраджэння (першая дала нам пачынальнікаў новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя, К. Каліноўскага і В. Дуніна-Марцінкевіча, а другая — Ф. Багушэвіча, Янку Лучыну і А. Абуховіча). Толькі праз год выйдзе ў свет першая паэтычная кніжка Янкі Купалы "Жалейка". Тады яшчэ не склаўся ў Купалы спецыфічна беларускі сімвалізм і рамантычная канцэпцыя творчасці як звернутага да народа прароцтва. Коласава паэма "Сымон-музыка" з'явіцца толькі праз дзесяць гадоў. Былі, праўда, выдадзены за мяжой Расійскай імперыі "Дудка беларуская" і "Смык беларускі" Ф. Багушэвіча ды "Скрыпачка беларуская" Цёткі — назвы, відавочна, сімвалічныя для нацыянальнага Адраджэння; але тады іх сімвалічны сэнс яшчэ не быў усвядомлены літаратурнай грамадскасцю і ўспрымаўся як знак этнаграфічнай народнай культуры, з якой і пачыналіся вытокі нацыянальнай літаратуры.

Багдановічаў "Музыка" таксама паходзіць адтуль, з фальклору, але ў гэтым просценькім эскізе ёсць ужо свядомая ўстаноўка на стварэнне паэтычных сімвалаў. У ім пазначана драма станаўлення новай нацыі, якую не хацелі прызнаць злыя і моцныя людзі, выкрываецца гістарычны падман, спроба чужых туркаў і сваіх янычараў падмяніць самую душу народа, падсунуць яму чужыя каштоўнасці.

Сёння вобраз Музыкі прызабыўся ў грамадскай свядомасці, хоць і назаўсёды застаўся нашым літаратурным сімвалам, асабліва пасля выхаду ў свет геніяльнай паэмы Якуба Коласа "Сымон-музыка". Затое другі адраджэнскі сімвал — сінявокі васілёк застаўся паэтычнай метафарай Беларусі і нават замацаваўся ў масавай культуры. А яго паэтычны радавод пачынаўся з верша М. Багдановіча "На чужбіне" (1908), упершыню апублікаванага 15 кастрычніка 1909 года ў "Нашай ніве". Яшчэ не былі створаны чарадзейныя санаты "Зачараванага царства", калі паэту прыснілася гэтая кветка Беларусі: "Вакол мяне кветкі прыгожа красуюць, // Маркотна між іх я хаджу адзінок, // Аж бачу — мне сіняй галоўкай ківае // Наш родны, забыты ў цяні васілёк. // "Здароў будзь, зямляча!" — Чуць бачны ў даліне, // Панура, нявесела шэпча ён мне: // "Успомні, мой дружа, ў багатай чужбіне // Аб беднай, далёкай сваёй старане".

Верш "На чужбіне" сімвалічны яшчэ ў іншым плане. Сапраўды, паэт жыў у Расіі, вакол яго прыгожа красавалі кветкі блізкай яму, але не роднай культуры. Ён ведаў яе, але заставаўся самотным, пакуль не прыкмеціў "забыты ў цяні васілёк" — сімвал Беларусі, роднай мовы і культуры. А ўспомніў "у багатай чужыне" сваю "бедную, далёкую старонку", аддаў жыццё сваё дзеля яе адраджэння і духоўнага ўзбагачэння. Урэшце, васілёк у жыцце меў яшчэ для нашага паэта іншы, агульначалавечы сімвалічны сэнс, пазначаў мастацкія і духоўныя каштоўнасці наогул.

Так спакваля ўзнікала трохчастковая паэтычная саната васілька. Верш-васьмірадковік "На чужбіне" быў яе экспазіцыяй, дзе пазначаны нацыянальна-спецыфічны сэнс тэмы. Пазней ён вярнуўся да яе распрацоўкі ў апавяданні, ці, больш дакладна, евангельскім белым вершы "Апокрыф", апублікаваным у "Калядная пісанцы" за 1913 год. У яраслаўскай "Северной газете" (1—2 студзеня 1914 года.) твор друкаваўся ў аўтарскім перакладзе пад назвай "Притча о васильках". Пра тое, што М. Багдановіч уклаў у гэты твор свае самыя патаемныя думкі пра чалавека і мастацтва, сведчыць лірычная форма выказвання ("ад Максіма Кніжніка пачатак") і жанр евангельскага сказу — свайго роду добрая звестка пра Бацькаўшчыну, народ, яго сапраўдныя каштоўнасці.

З трох частак гэтай сімвалічнай санаты васілька М. Багдановіч уключыў у "Вянок" сваёй паэзіі толькі заключную песню-рэпрызу "Слуцкія ткачыхі". Любімая народная кветка ў "Апокрыфе" выступае сімвалам быційнай рэальнасці — народнай душы, духоўных каштоўнасцей, аб'ектызаваных у гісторыі і нацыянальнай культуры народа. Яна з'яўляецца там яшчэ разгорнутай метафарай, вобразна выяўляе эстэтычныя погляды аўтара. У лірычным шэдэўры "Слуцкія ткачыхі" паэтычны сімвал пераносіцца ў таямніцу суб'ектыўнай душы таленавітых жанчын-мастачак, якія, паводле мастацкай праўды, а не эмпірычнай гісторыі, ткалі славутыя на ўвесь свет залатыя паясы.

Паводле беларускіх народных традыцый, ткацтва — спрадвечная жаночая справа, а мужчына-ткач выглядае фігурай крыху камічнай, гратэскавай. (З гісторыі мы ведаем, што ткачы перыяду мануфактурнай вытворчасці — пераважна мужчыны, а майстры слуцкіх паясоў былі яшчэ выдатнымі ювелірамі). Вобраз мужчыны-ткача не стварыў бы таго высокага лірычнага драматызму, якога дасягнуў М. Багдановіч з першых радкоў сваёй песні: "Ад родных ні[illegible] ад роднай хаты // У панскі [illegible] дзеля красы // Яны, бяздол[illegible], узяты // Ткаць залатыя паясы". А яшчэ паэт імкнуўся стварыць тут сардэчна-душэўны, лірыка-мастацкі вобраз Бацькаўшчыны, а не той яе духоўна-гераічны і мужны пачатак, які [illegible] узнёсла загучаў пазней у [illegible] "Пагоня". За доўгія часіны [illegible]анскім двары, ткучы "шырокія тканіны на лад персідскі", ткачыхі забылі свае "дзявочыя сны". Але думкі міжволі імкнуліся "туды, дзе расцвіла вясна; // дзе блішча збожжа ў яснай далі, // Сінеюць міла васількі". І вось адпалі класічныя каноны: "І тчэ, забыўшыся, рука, // Заміж персідскага ўзора, // Цвяток радзімы васілька".

М. Багдановіч справаю даказаў, што ён умее грунтоўна даследаваць гісторыю і культуру беларусаў ды іх братоў-славян. Але ў мастацтве ён заставаўся лірыкам. У гісторыі роднага краю паэт адкрываў непаўторную чалавечую асобу, паўнату і напружанасць душэўнага жыцця, выявіўшы пры гэтым надзвычайную сілу мастацкай інтуіцыі, якая, быццам у кінематографе, ахоплівала жывую плынь далёкай мінуўшчыны ("Летапісец", "Агата", "Песня пра князя Ізяслава Полацкага " і інш.).

Паэт пражыў кароткае жыццё ўдалечыні ад сваёй любові — апетай ім Бацькаўшчыны. Ці не таму ён так пранікліва сказаў пра беларусаў-уцекачоў у "Эмігранцкай песні"? Ці ёсць у сусветнай лірыцы твор такога трагічна-светлага гучання пра нявольных эмігрантаў? Драматызм песні грунтуецца на кантрастным супастаўленні двух псіхалагічных тыпаў і чалавечых лёсаў. Вось тып спрадвечнай "варажскай" вольніцы: "Ёсць на свеце такія бадзягі, // Што не вераць ні ў Бога, ні ў чорта. // Ім прыемны стракатыя сцягі // Караблёў акіянскага порта". Ім усё роўна — жыць ці загінуць. Абы толькі "пабываць у краях незнаёмых ды зазнаць там і шчасце і гора". Не таго жадаюць беларусы-бежанцы: не рассталіся б яны з родным краем, каб было дзеля іх у нас хлеба. І на вулках чужых гарадоў, пад грукат і гоман ім "маячыцца вёсачка, Нёман і агні партовыя Лібавы". Верыцца, што гэтыя людзі, павязаныя жывымі ніткамі душы з роднымі карэннямі, вернуцца ў свой край, каб адраджаць Бацькаўшчыну.

Уладзімір КОНАН.

Працяг.
Пачатак у №№ 40 — 42.

Сяргей ГРАХОЎСКІ

ПРЫЗНАННЕ

У пакоі паўзмрок. Я адзін,
А за вокнамі восень
Шапаціць у апалым,
пасохлым лісці.
Не прыпомню ніяк,
Што збылося і што
не збылося
У заблытаным нашым
З табою жыцці.

Можа, лёс, можа, рок,
Можа, шчасце ці гора
Нас насустрач вялі
Праз усе міражы,
Праз пяшчоты, давер,
Недавер і дакоры.
І вядуць, як вялі,
Да апошняй мяжы.

Наша горкая доля
За намі цікуе заўсёды.
У пакоі паўзмрок,
А за вокнамі дождж ык
імжыць.
Я адзін. Вось і выпала
ўрэшце нагода,
Каб прызнацца, што дня
Без цябе не пражыць.

Рыгор БАРАДУЛІН

МАЛІТВА

Я ў свеце настолькі адзін,
Я ў свеце настолькі
маленькі,
Што памяці сцёртай
каленькі
Збіваю,
Паўзу ў напамін,

Каб Бог не забыўся мяне,
Ды я перад Богам маленькі,

Мае Ён не ўчуе маленні
І нават уніз не зірне.

Як спусціцца Бог на зямлю,
Дык я, перад небам
маленькі,
Даткнуся да лёгкай кавенькі
І крыўды на попел спалю.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

СТРАЛА

У вадзе халоднай
праплываюць цені.
Човен серабрысты
зачарпнуў вады.
І вясло сплывае,
і стралок пацэліў
У другую постаць.
Зловяць чараты
Тонкімі рукамі
ўцекачоў знямелых.
А стралок устане
з мокрае травы.
Абтрасе адзенне,
пералічыць стрэлы
і па грошы пойдзе
ў замак радавы...
Спіць срабрысты човен
у тумане срэбным.
Прада мной — папера,
а ў руцэ — агонь.
І праз чысты аркуш
працякаюць цені,
І стралок у лозах
грэе, трэ далонь...
Дай паплыці думкам
срэбнымі радкамі —
Знойдзецца да сэрца
гостры шлях стралы,
Замак, дзе заплацяць,
і магільны камень,
І анёльскіх, белых,
лёгкіх два крылы.

Максім ТАНК

ЛІТАНІЯ

Я не прашу ў цябе спагады,
Ні ўзнагароды і ні ўлады.

Дай толькі ты маёй краіне
Мір і спакой пад небам сінім,

На бацькаўскай страсе —
буслянку,

Шыпшынавы куст —
каля ганка,

Калоссе шчодрае — на ніве,
Напеваў родных пералівы,

А ў засені дубровы недзе,
Дзе спяць мае бацькі,
суседзі —

Хоць непрыкметную мясціну

Свайму тулягу, адпачынак.

За што гатоў я свой аўтограф

Паставіць пад любы цыраграф.

ГАРАЧЫ ЖНІВЕНЬ 1991 ГОДА

У ГАСЦЯХ У НАТАЛЛІ АРСЕННЕВАЙ

"...ІМКНУ Я Ў ЗОЛЬ І ВОСЕНЬ ШУКАЦЬ КРЫНІЦ, ЗЬ ЯКІХ Я НЯ ПІЛА"

Машына плаўна ўкаціла ў дворык ладненькага катэджа, якімі густа аблеплена вуліца амерыканскага гарадка Рочэстэра. Утульна, ціха, яркія кветкі пад вокнамі, на ўсёй палянцы перад будынкам. Мусіць, так бывае ў раі, падумалася.

Высокі мужчына сярэдніх гадоў адчыніў дзверцы аўтамабіля, працягнуў руку, прадставіўся: "Кушаль" і павёў у дом. Спадарыня Наталля Арсеннева ўжо чакала нас. Пругка паднялася з крэсла і гучным, хрыплаватым голасам паклікала: "Наталля, Владэк! Яны прыехалі! Хадзіце сюды. Алюнься прывезла чалавека з Беларусі!" Пакуль гаспадары разглядалі "чалавека з Беларусі", я не з меншай цікавасцю — спадарыню Арсенневу. Адзначыла пра сябе: у нас так немаладыя кабеты не апранаюцца.

Але амерыканцы сапраўды, я заўважыла, без комплексаў. Порткі з кашуляй — зручна. На нагах белыя пантофлі на абцасах. Да чорных валасоў вельмі пасуюць белыя завушніцы і белыя пацеркі. Элегантна і з густам. На свае 88 гадоў выглядае проста выдатна. "Ад яе зыходзіць моц, упэўненасць і энергія", — было першае ўражанне.

Сцены гасцёўні завешаны карцінамі, на якіх беларускія пейзажы работы П. Мірановіча: "Краслаўка", "Млын у Краслаўцы", "Доўгае возера"... Вобразы роднай прыроды штодня лашчаць вока гаспадыні дома.

Зручна размясціўшыся ў крэслах, мы з Алай Орса-Рамана падрыхтавалі дыктафоны, каб запісаць гутарку з вядомай паэткай. Адразу і без цырымоній гаспадыня захапіла ініцыятыву, мусіць, ужо прадумаўшы нейкі план свайго расказу.

— Я жыву разам з сынам і ўнучкай — вы іх ужо бачылі. А ёсьць яшчэ і ўнук, яму 30 гадоў. Мае ўласны дом, недалёка ад нашага. Так што мы бачымся час ад часу. Натальля гаворыць у нас па-руску. Гэта таму, што яе першыя некалькі год выхоўвала жанчына, якая размаўляла па-руску. Натальля разумее па-беларуску, толькі гаварыць не можа. Ну і вось гэтыя два мае любімцы сабакі. Так і жывём.

— Якія перыяды жыцця, спадарыня Арсеннева, найбольш вам памятаюцца?

— Памятаю, як была эвакуацыя Вільні, гэта ў першую сусветную вайну. Нас тады прымусова эвакуіравалі, і мы трапілі ў Яраслаўль. Мне было нешта 12 гадоў... Я там пачала вучыцца ў гімназіі.

Цікавым, дарэчы, можа быць той факт, што да восені 1916 года ў Яраслаўлі жыў Максім Багдановіч. Яны хадзілі па адных вуліцах. Але іх шляхі ніколі не перакрыжаваліся. Між тым, менавіта гэты паэт найбольш паўплываў на яе. У яраслаўскай гімназіі Наталля пачала спрабаваць пісаць вершы. Але, як сведчыць сама паэтка: "Пісаць я пачала ня вельмі рана, у кожным выпадку не з пяцёх ці каб дзесяцёх год, як некаторыя "геніі". Не, у гэтым часе я любіла ўзімку чытаць, зашыўшыся недзе ў куток, а ўлетку — гайсаць па палёх і лазіць па дрэвах, што я рабіла лепш за хлопцаў".

— Вы напісалі свой першы верш у той год, калі ў Расіі адбылася сацыялістычная рэвалюцыя. Як яна ўвайшла ў свядомасць падлетка?

— Мы з сястрой Галяй ішлі з гімназіі і ўбачылі, як нейкія людзі ў вайсковым зьбіваюць з хаты выяву вялізнага арла — сімвал царскай імперыі. Адна лапа птушкі ўпала паблізу мяне. Было такое ўражаньне, што раструшчылі жывую птушку. А я так любіла, ды і цяпер люблю розную жывёлу. З таго часу слова рэвалюцыя выклікае ў мяне асацыяцыі з разбурэньнем, з насільлем. Рэвалюцыя, вайна — гэта страшна, гэта агідна, гэта кроў, гэта пакуты і гора людзей.

— У 1918 годзе вашыя бацькі вырашылі вяртацца з Яраслаўля ў Вільню. Неўзабаве яны і рушылі ў шлях. Але толькі ў пачатку 1920 года апынуліся на месцы. Няўжо цэлы год дабіраліся?

— Так. Цяжкі быў шлях дадому. Вяртаючыся з бежанства, мы столькі перажылі... Часта траплялі пад перастрэлку. Было небяспечна. Знайшлі тады прытулак у вёсцы Жаўніна. Тут я ўпершыню, можна сказаць, пачула жывую беларускую мову. Гаспадары — Фядосься і Юрка сварыліся: "Чакай, чакай, я ўжо табе юшку пушчу!" Гэтак смачна, каларытна гучала слова. Але доўга мы там быць не маглі. З Краслаўкі хадзілі таварныя цягнікі ў Дзьвінск. Мы неяк уціснуліся. А тут мост праз Дзьвіну разбіты, цягнік далей не ідзе, трэба пераходзіць раку. Добра памятаю, як мы нейкія клункі цягнулі па лёдзе. А ў мяне і ў сястры гарачка, усё ў галаве круціцца. Як сёньня, бачу той дзень.

— Спадарыня Арсеннева, вы сказалі, што людзі ўцякалі з Расіі. Было масавае бежанства. Чаму? Баяліся бальшавікоў?

— Выязджалі [illegible]іраваныя. Вярталіся дамоў. А пра бал[illegible]авікоў мы тады нічога кепскага не чулі. І ніхто нас не гнаў. Дык я хачу закончыць. На Дзьвінскай станцыі я бачыла такое, што назаўсёды мне запала ў душу, перавярнула яе, уварвалася ў юнацтва цёмнай хмарай. На падлозе хворыя, раненыя. А [illegible]ры станцыі — была ж лютая зіма — [illegible]рзлыя трупы польскіх жаўнераў. У недарэчных позах, з адкрытымі вачыма.

Нейкім дзівам мы дабраліся да Вільні, дзе мама наняла павозку і ледзь жывых завезла нас да нейкіх людзей. Гэта былі Русецкія, дзякуючы якім і я, і мае брат і малодшая сястра Оля паступілі пазней вучыцца ў Віленскую беларускую гімназію. А сястра Галя тады ад гішпанкі памерла.

— У Віленскай гімназіі вы, напэўна, упершыню захапіліся беларускімі справамі? Раскажыце, калі ласка, хто там выкладаў і хто быў для вас найбольшым аўтарытэтам?

— У нас былі добрыя настаўнікі — Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Браніслаў Тарашкевіч, Аркадзь Смоліч. Яны навучылі мяне многаму. Дарэчы, я была ўжо трохі падрыхтаваная да заняткаў у гімназіі. Люба Русецкая пасля хваробы прынесла мне беларускія кніжкі, пачала вучыць чытаць. Так я прачытала "Патаемнае" Гарэцкага. І з таго часу стала нераўнадушнай да яго твораў. Пранікласяс сімпатыяй да гэтага чалавека, паказвала яму свае вершы. Ён быў маім крытыкам і дарадцам.

Пра гады вучобы ў гімназіі паэтка неяк пісала: "Два гады навукі ў гімназіі... былі бадай найцяжэйшыя ў матэр'яльным дачыненьні гады майго жыцця, і што вельмі часта на працягу гэтых год даводзілася мне класьціся спаць бязь вячэры, ці выходзіць у гімназію бязь сьнеданьня, я заўсёды ўспамінаю іх зь нейкай асаблівай любасьцяй і ўсхваляваньнем. Можна сказаць, што якраз Віленская беларуская гімназія і зрабіла зь мяне беларускую паэтку Натальлю Арсеньне[illegible]кая ня можа ня пісаць, як ня мож[illegible]любіць Беларусі, што-б ня сталася яшчэ на сьвеце".

— Скажыце, а хто на вас, як на паэтку, акрамя Багдановіча, меў яшчэ ўплыў?

— Купала. Увогуле, я шмат [illegible]ла, цікавілася паэзіяй. Мне запомн[illegible] асобныя вобразы: Роланда, напрыклад, з французскай літаратуры. "Роланд усё трубіць і трубіць"... Метэрлінка любіла. З расейскіх — Лермантава. Хаця пазьней, калі больш глыбока спазнала расейскую літаратуру, на першае месца паставіла Пушкіна.

Дазволю сабе маленькі каментарый: бацька Наталлі Арсенневай паходзіў з таго роду Арсенневых, які па сваёй жаночай лініі даў паэта М. Лермантава.

— Гавораць, што беларус — гэта чалавек, які паўсюль спазняецца. Ціхі, паслухмяны, разважлівы, але і ўпарты. Як бы вы вызначылі беларускі характар?

— Беларусы — гэта мешаніна чыстых славянаў з балтамі. Лагоднасьць, мяккасьць, разважлівасьць — гэта рысы якраз славянскія. Ёсць у нас крыху і летувіскай крыві. Украінцы зусім іншыя, яны маюць продкаў з качаўнікоў паўдзённых.

— А як вы спазнавалі гісторыю свайго народа, яго культуру? Што вам дало найбольшае разуменне?

— У Віленскай гімназіі былі добрыя падручнікі. Хаця і не ўсе па-беларуску напісаныя. Да прыкладу, з падручніка геаграфіі Сьпірыдонава я ўпершыню даведалася пра беларусаў, што маюць яны сваю літаратуру, свайго вялікага паэта Купалу. Зьвесткі пра Беларусь былі пададзены дробненькім шрыфтам, як дадатковы матэрыял і неабавязковы для завучваньня. Памятаю, як мяне ўразілі Купалавы радкі:

Я мужык-беларус,
Пан сахі і касы;
Цйомен сам, белы вус,
Пядзі дзве валасы.

Слова "цйомны" я доўга не магла расчытаць.

— Як спалучаліся расейская і беларуская мовы ў выкладанні асноўных прадметаў у гімназіі?

— У малодшых клясах усё было па-беларуску. А ў старэйшых — і так і гэтак. Але вучні стараліся добра авалодаць мовай.

— Пасля заканчэння Беларускай гімназіі многія выпускнікі адправіліся на вучобу ў Прагу. У вас быў намер паехаць?

— Так. Але я не магла пакінуць бацькоў. Яны былі старыя, нямоглыя. І жылі толькі з таго, што я выкладала ў адной з беларускіх школак. А па-другое, я тады якраз пазнаёмілася з маім будучым мужам. Ён прасіў мяне застацца. Я прыйшла на станцыю, калі ад'язджалі мае каляжанкі, толькі каб развітацца.

Таццяна АНТОНАВА.

(Заканчэнне гутаркі з Н. Арсенневай у наступным нумары).

Лепшай майстрыхай ручнога ткацтва і мастацкай вышыўкі па льняному палатну лічаць жыхары вёскі Шэпялевічы Круглянскага раёна сваю аднасяльчанку, энергічную і вясёлую не па гадах, 76-гадовую Вольгу ПАЛЯКОВУ (на здымку). Вытканыя ёю абрусы, пакрывалы, дарожкі-палавікі, вышытыя ручнікі і сурвэткі ўпрыгожваюць не толькі дом майстрыхі і кватэры яе дзяцей, але і экспазіцыі музеяў у Магілёве і Мінску і выклікаюць заслужанае захапленне наведвальнікаў выставак беларускай народнай творчасці.

Фота І. ЮДАША.

НА ВАРЦЕ НЯСВІЖА

СЛУЦКАЯ БРАМА

Была навальніца. Пад'язджаючы са сваім сябрам Аляксандрам Козічам на машыне к Нясвіжу, у святле маланак мы ўбачылі незвычайнае збудаванне. Гэта была славутая Слуцкая брама. Брама па-беларуску — крытыя зверху вароты, ці яшчэ абарончыя вароты.

Вельмі цікава, чаму гэтыя вароты атрымалі назву Слуцкай брамы. Справа ў тым, што Нясвіж ляжаў на шляху з Слуцка ў Вільню. І найменне было дадзена па значнасці, якое меў у тыя часы горад Слуцк.

Слуцк — старажытны беларускі горад, вядомы па "Аповесці мінулых гадоў" яшчэ з 1116 года. У 1593-м праз Слуцк у Канстанцінопаль ехаў маскоўскі дзяк Трыфан Карабейнікаў. Ён пасля сябе пакінуў цікавыя звесткі, у тым ліку і такую: "...а посадом и городом и торги тот город Слуцк города Менска больши и лутчи. А в воротах и острозе стоят воротники и стрельцы с рушницами, иноземца не сказав и в острог не пустят". Вось чаму ў Нясвіжы няма Мінскай брамы, не было і Мінскай вуліцы. Слуцкі напрамак быў і самы важны абарончы фарпост і таму атрымаў назву Слуцкай брамы. Акрамя яе, сярод абарончых збудаванняў былі Віленскія, Замкавыя і Клецкія вароты... Цяпер ад іх засталіся толькі вежа Замкавых варот і Слуцкая брама.

З архіўных крыніц даведаўся, што другімі па важнасці сярод абарончых збудаванняў былі Віленскія вароты, на жаль, час іх не захаваў.

Як кажуць гістарычныя крыніцы, на месцы сучаснай Вільні стаяў горад аднаго з усходнеславянскіх плямён крывічоў і меў назву Крыўгорад, ці Крывы горад. Нясвіж, знаходзячыся на шляху паміж Слуцкам і Вільняй, збудаваў дзіўныя абарончыя помнікі дойлідства, якія, як, да прыкладу, Слуцкая брама, выклікаюць наша захапленне і гонар за старажытных дойлідаў. Тым, хто тады пад'язджаў к Нясвіжу з нядобрымі, варожымі намерамі, Слуцкая брама грозна напамінала аб прысутнасці яе абарончых збудаванняў.

Па энцыклапедычных кнігах, Слуцкая брама была пабудавана ў XVII—XVIII стагоддзях. Але вось выдадзеныя некалькі гадоў таму назад "Архітэктурныя помнікі Нясвіжа" (аўтары У. Чан-

(Заканчэнне на 8-й стар.).

НА ПТУШЫНЫМ РЫНКУ

...Успамінаецца дзяцінства: бацька і маці збіраюцца з раніцы на рынак. Ловяць у куце парасят, садзяць у клетку, што стаіць на возе. Я хаваюся ў хаце і затыкаю вушы, каб не чуць вішчанне маленькіх жывёлін, бо вельмі шкадую іх. Яшчэ ўчора гуляў з гэтымі дураслівымі і вельмі забаўнымі істотамі, цяпер жа ўжо бачу іх апошні раз.

Здаралася, што схавацца не ўдавалася. Гэта тады, калі бацька вёў на повадзе карову на рынак, а мяне прымушаў падганяць яе, каб паспець заняць лепшае месца. Па дарозе я паспяваў рваць траву, падкормліваў Красулю. З рынку збягаў адразу: балюча было бачыць, што нашу карову павёў назаўжды незнаёмы дзядзька. Так было. І нават у маленстве добра разумеў, што так і трэба. Прадавалі хатнюю жывёлу, каб займець рубель і купіць хлеба ці адзенне — час быў цяжкі, пасляваенны, — каб пусціць грошы на пабудову хлява ці на новы вянок падрубы ў старой хаце. І ўсё ж да рынкаў, якія цяпер ёсць у кожным вялікім і малым горадзе і называюцца птушынымі, у мяне адмоўнае стаўленне. Тым больш, што для многіх, як іх называюць, кліентаў рынак стаў сапраўдным месцам бізнесу.

Адразу гэта кідаецца ў вочы, калі наведваеш гандлёвыя рады Старажоўкі ў Мінску. Тут прадаюць ужо не толькі свойскую жывёлу, але і катоў, сабак, дзікіх птушак, дэкаратыўных рыбак. Прадаюць, каб сабраць капітал. Толькі адзін прыклад. Шчанё пародзістай сабакі часам каштуе не сотні, а ўжо тысячы рублёў! Крыўдна бачыць, калі такімі засмучанымі пакідаюць рынак дзяўчынкі і хлопчыкі, бацькі якіх з-за вялікага кошту не змаглі купіць сваім дзецям тое ж шчанё ці коціка, папугая ці "залатую" рыбку.

Праўда, і тут не бывае без выключэнняў. Не-не ды і знойдзецца добрая душа, што і цану знізіць, і пра радаслоўную жывёл раскажа, і чым карміць хамяка ці белую мыш, як лячыць іх... Адным словам, дзіцячае шчасце і трывога, заклапочанасць дарослых, надзеі на "значны куш" гандляроў — ўсё зліваецца ў шматгалоссі птушынага рынку і на Старажоўцы, і ў іншым горадзе Беларусі.

Яўген ІВАНОЎ.

НА ЗДЫМКАХ: на Старажоўскім рынку ў Мінску; "...я каза-дзераза. Цікава, хто ж мяне купіць?"; набудзеце папугайчыка — будзе з кім пагаварыць; ад такой гаспадыні лепей адвярнуцца, не любіць яна мяне, коціка-маркоціка.

Фота У. ВІТЧАНКІ.

СЛУЦКАЯ БРАМА

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.).

турыя і Ю. Казакоў) адносяць час збудавання гарадскіх абарончых умацаванняў, у тым ліку і Слуцкай брамы, к канцу XVI стагоддзя. У гэтай брашуры гаворыцца, што збудаванне зачыняла ўезд у горад з боку Слуцкага тракта. Тут пачыналася працяглая дамба, якая стварала запруду — возера на рацэ Ушы. Ад Слуцкай брамы пачынаецца і адна з найпрыгажэйшых вуліц горада — Слуцкая.

Калісьці праз гэтую браму і вуліцу выязджалі і ўязджалі са сваёй шматлікай світай і чэляддзю магутныя былыя літоўска-беларускія магнаты Радзівілы, якія дзякуючы пачатаму будаўніцтву свайго радавога замка (жамчужына беларускага дойлідства), культавых і абарончых збудаванняў, увайшлі ў гісторыю і зрабілі тым самым славутым горад Нясвіж. Тут асаблівае слова варта сказаць пра князя Радзівіла Сіротку, які для абнаўлення Нясвіжа і яго новага будаўніцтва запрасіў італьянскіх дойлідаў. І сярод іх Яна Марыю Бернардоні, які пакінуў пасля сябе цуд архітэктуры — фарны касцёл. Гэта жывы ўзор рымскага храма Іль-Джэзу.

Зусім блізка ад Слуцкай брамы стаіць помнік вялікаму беларускаму гуманісту Сымону Будному, які ў 1562 годзе выдаў тут першую кнігу на беларускай мове "Катэхізіс", а потым выступіў супраць рэлігійнага цемрашальства і напісаў шырока вядомую кнігу "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад богам". Варта ўявіць, што гэтыя і іншыя кнігі разыходзіліся па Белай Русі і па цэлым свеце праз Слуцкую браму. Праз яе таксама і вывозілася абсталяванне для будучай сусветна вядомай мануфактуры ў горадзе Слуцку, дзе рабіліся непаўторныя ўзоры ...віўных паясоў з залат... ...ярэбраных ніцей на шаўковай аснове.

...Мы стаім побач са Слуцкай брамай і як бы чуем жывы голас гісторыі. У час руска-польскай вайны 1654—1667 гадоў двойчы рускія войскі праз яе ўваходзілі ў горад Нясвіж. У маі 1706 года праз Слуцкую браму праходзілі шведы, у 1764-м прыступам яе бралі літоўцы. У 1793 годзе Нясвіж увайшоў у састаў Расійскай імперыі, а ў 1812-м яго захапілі французы. Але гісторыя горада, як і Слуцкай брамы, на гэтым не спынілася. У першую сусветную вайну і ў Вялікую Айчынную тут былі лютыя баі з кайзераўскімі войскамі і нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Вельмі дзіўна, як у Малоху шматлікіх войн ацалела гэта абарончае збудаванне, даруючы моц, волю і надзею гораду, яго жыхарам.

Магутная, велічная і ў той жа час непаўторная як помнік дойлідства Слуцкая брама! Калісьці на яе месцы была цытадэльная вежа, а пасля мясцовыя майстры перарабілі яе на свой густ і ў сувязі з запатрабаваннямі часу ўмацавалі контрфорсамі вароты. Для будаўніцтва выкарыстоўвалі цэглу, замацоўваючы яе асабліва трывалым растворам на птушыных яйках. Збудавана Слуцкая брама ў стылі барока. Па адных звестках, яна перараблялася ў 1700 годзе, па другіх крыніцах, — у 1760.

Арачны праезд складае 10,3 метра. Абарончая — гэта толькі адзіная функцыя Слуцкай брамы. Яна з'ўлялася і своеасаблівай сярэдневяковай мытняй. Захаваўся і надпіс на адной з шыльдаў. "Тутака святы збор, тутака збор мытны дай для Марыі, так як кожны павінен богу, а за гэта атрымаеш узнагароджанне на зямлі, а пасля яе на нябёсах..."

Для аховы варот і спагнання мытных збораў на першым паверсе спецыяльна быў прадугледжаны пакой для варты і чыноўніка, які ажыццяўляў таможны збор з кожнага падарожніка ці купца, хто ўваходзіў ці прыязджаў у горад. Для абагравання людзей быў прадугледжаны камін. На другі паверх вялі сходы. Тут была капліца з вялікім праёмам у бок горада. Каваны балкон з боку ратушы сведчыць аб высокім мастацкім гусце майстроў па металу.

У 1970 годзе Слуцкая брама была рэстаўрыравана. Але ва ўсёй Беларусі не знайшлося чырвонай чарапіцы для яе даху. Яе знайшлі і прывезлі з Латвіі.

Некалькі разоў я быў у Нясвіжы. Вось і ў апошняе наведванне разам з сябрам прынёс кветкі да Слуцкай брамы і паклаў іх ля яе падмурка, каб аддаць даніну пашаны сіле і моцы гэтага збудавання, яго заступнікам.

Першы раз, калі я быў у Нясвіжы, пачуў дзіўныя словы, што горад будзе жыць да тых часоў, пакуль будзе стаяць Слуцкая брама. Нічога дзіўнага ў гэтых словах я не знайшоў. Таму што Слуцкая брама ўвесь час была на варце Нясвіжа. А калі варта не дрэмле, то горад адчувае сябе спакойна.

Міхаіл МАЛІНОЎСКІ,
правадзейны член Геаграфічнага таварыства пры Акадэміі навук СССР.

г. Баранавічы.

СПОРТ

ЕЎРОПА "ХВАРЭЕ" ФУТБОЛАМ

Апошнія тыдні Еўропа жыве футболам. Першыя гульні за Кубкі кантынента, адборачныя турніры, завяршаючыя матчы нацыянальных чэмпіянатаў — ...аборніцтвы на любы густ. ...рыемна, што і савецкія каманды былі ў цэнтры ўвагі аматараў і спецыялістаў спорту.

Даволі ўдала стартавалі ў еўрапейскіх кубкавых турнірах нашы футбалісты. Маскоўскія "Спартак", "Тарпеда", "Дынама", а таксама кіеўскае "Дынама" паспяхова пераадолелі першы бар'ер.

Асаблівая ж увага была прыкавана да адборачнага матча зборных СССР і Італіі. Гэта сустрэча практычна называла фіналіста першынства Еўропы, якое пройдзе ў наступным годзе ў Францыі. Становішча ў турнірнай табліцы абавязвала італьянцаў гуляць у Маскве толькі на выйгрыш, каб прадоўжыць барацьбу за медалі. Нашым жа футбалістам дастаткова было і нічыёй. І яны яе дамагліся. Матч у Маскве завяршыўся ўнічыю — 0:0.

Сярод лепшых ігракоў сустрэчы трэнеры абедзвюх каманд назвалі мінчаніна Сяргея Алейнікава. "Ён вельмі ўмела дырыжыраваў дзеяннямі нашых футбалістаў", — адзначыў кіраўнік зборнай СССР Анатоль Бышавец. А хіба ж Сяргей можа дазволіць сабе гуляць напаўсілы ў такіх важных сустрэчах?!

Успомнім адборачныя гульні і ў Італіі, і ў Венгрыі, і ў Нарвегіі... Кожны раз мінчанін заслугоўваў самых высокіх адзнак.

Так ужо атрымалася, што і алімпійскай зборнай Савецкага Саюза прыйшлося рашаць, быць ёй ці не быць фіналістам Алімпійскіх гульняў менавіта з італьянцамі. На гэты раз ролі памяняліся: цяпер ужо нашых футбалістаў не задавальняла нічыя. 1:1 — такі лік у матчы алімпійцаў, які прайшоў у Сімферопалі.

Што цяпер? Пакуль усё ў тумане. Некалькі еўрапейскіх каманд адмовіліся ад Алімпійскіх гульняў. І можа нават другое месца дасць магчымасць зборнай СССР паехаць у Барселону. Слова за Алімпійскім камітэтам.

Імя аднаго з членаў зборнай СССР па футболу мінчаніна Эдуарда Малафеева добра вядома ў спартыўным свеце. У апошнія гады ён трэніраваў галоўную каманду краіны, доўгі час кіраваў Малафееў і дынамаўцамі Мінска. І вось навіна: ён пакідае гэтую пасаду. Навіна не зусім прыемная.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС

220600, МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Газета аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку».
Індэкс 63854. Заказ № 1611.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12